Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 СТУДЗЕНЯ 2016 г. СУБОТА № 3 (28113) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Цуд рознакаляровага дзяцінства

СТАР. 5



Верталёт сеў... ля Палаца Рэспублікі

СТАР. 13



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

# ДЗЕЛЯ МІРУ І ДАБРА

## Асноўнай сутнасцю дзяржаўнай палітыкі ў далейшым стане падтрымка дзяцей і старых

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка, прысутнічаючы на калядным богаслужэнні ў Мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы.**

Кіраўнік дзяржавы павіншаваў усіх прысутных, увесь беларускі народ са святам Раства Хрыстовага, пажадаў міру і дабра, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што заўсёды няпроста гаварыць у храме. «Складана таму, што не толькі тыя, хто тут прысутнічае, але і тыя, хто пачуе мяне ў гэтае свята, заўсёды асаблівую ўвагу звяртаюць на акцэнты, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Напэўна, не месца сёння для будзённых размоў, тым не менш скажу пра тое, што тычыцца нашай краіны».

«Я рызыкнуў нядаўна, у канцы мінулага года, сказаць, што наступны год не будзе лягчэйшым, чым папярэдні. Вы бачыце, што адбываецца вакол нашай краіны. Многія людзі ў нас у грамадстве гавораць па-беларуску: «Добра, перажывём, абы не было вайны». Я не прытрымліваюся гэтага лозунга. Жыць трэба заўсёды. І мы будзем заўсёды жыць годна і нармальна. Але ў гэтым ёсць глыбокі сэнс, — працягнуў кіраўнік дзяржавы. — І мы ў гэтым пераканаліся на прыкладзе нашых суседзяў: калі вайна, тады не хочацца нічога. Толькі міру. Толькі б захаваць жыццё. І людзі думаюць нават не пра сябе. Людзі думаюць пра сваіх дзяцей. Таму першы наш зварот да Госпада, каб ён сапраўды нас абараніў і захаваў нашу краіну такой, якой яна ёсць цяпер. Большага мы проста не смеем прасіць сёння. Таму што ўсё астатняе залежыць ад нас». Бо калі будзе мір, то чалавек зможа зрабіць усё, лічыць Прэзідэнт.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

### ЛІЧБА ДНЯ

**$4 млрд 175,8 млн**

*склалі на 1 студзеня 2016 года, па папярэдніх звестках, золатавалютныя рэзервы краіны ў адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду. Падтрыманню ўзроўню золатавалютных рэзерваў спрыялі рэфінансаванне валютных абавязацельстваў Міністэрствам фінансаў і Нацыянальным банкам шляхам выпуску валютных аблігацый і прыцягнення крэдытных рэсурсаў у агульным аб'ёме каля $3,8 млрд, паступленні ад збірання экспартных пошлін на нафтапрадукты ў памеры $1,4 млрд, іншыя фактары. Акрамя таго — чыстая купля Нацыянальным банкам замежнай валюты на таргах ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа» ў суме $230 млн, якая сфарміравалася ў выніку перавышэння прапановы валюты над попытам на яе на ўнутраным валютным рынку.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.01.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18752,00 | ▲ |
| Еўра | 20100,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 254,53 | ▲ |
| Укр. грыўня | 797,96 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Пракаветнае

# КАЛЯДАВАЦЬ — ДЫК З «БУКЛЕЕМ»!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У вёсцы Багданаўка Лунінецкага раёна шырока святкуюць Раства ў першы дзень — 7 студзеня. І дарослыя, і дзеці, сабраўшыся ў гурты, ходзяць па вуліцах вёскі, спяваюць пад вокнамі песні пра нараджэнне Збавіцеля на свой палескі манер, носяць так званыя «буклеі». Багданаўскі буклей — арыгінальны мясцовы сімвал калядный зоркі.**

СТАР. 4

# ДЗЕЛЯ МІРУ І ДАБРА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў: «Нам трэба спадзявацца толькі на сябе, кожны чалавек павінен разлічваць толькі на сябе. А ўсё, што зможа дзяржава, гэта я вам абяцаю, яна зробіць для народа. Але гэта будзе ўжо ў плюс да таго, што вы зможаце зрабіць самі для сябе, для сваіх сем'яў і дзяцей».

«Я, наколькі гэта магчыма, дэманстраваў палітыку, якую мы будзем праводзіць у бліжэйшы час, — падкрэсліў Прэзідэнт. — І сутнасцю гэтай палітыкі стануць дзеці і старыя». Аляксандр Лукашэнка таксама заўважыў: «Як мы ставімся да старэйшага пакалення, так і да нас будуць ставіцца нашы дзеці. Дзеці — гэта наша будучыня. І мы для іх павінны зрабіць тое, што павінны». «Пры гэтым мы не павінны іх залішне засцерагагаць, апекаваць, — перакананы кіраўнік дзяржавы. — Яны ў нас мудрыя сёння, у іх ёсць магчымасць ва ўсім разабрацца, прытым правільна разабрацца. Трэба толькі дапамагчы накіраваць іх па правільнай дарозе, па якой яны павінны пайсці».

«Мы будзем рабіць усё, каб нашы дзеці раслі не толькі здаровымі, але і адукаванымі, — адзначыў Прэзідэнт. — Мы будзем рабіць усё, каб абараніць чалавека, зрабіць яго жыццё як мага больш доўгім. Дарэчы, мы і так нямала зрабілі за 10 апошніх гадоў, у нас сярэдняя працягласць жыцця вырасла прыкладна на 5 гадоў. Ні адна дзяржава ў свеце не дэманстравала такое павелічэнне працягласці жыцця. Таму мы будзем рабіць усё для здароўя, адукацыі людзей, для таго, каб чалавек сам потым мог сябе забяспечыць».

«Мы будзем жыць у абсалютна дэмакратычным прававым грамадстве, як мы жылі да гэтага часу, як бы нас ні крытыкавалі, — працягнуў Аляксандр Лукашэнка. — Праўда, крытыкі, якія нас падвяргалі збіванню ў гэтым пытанні, сёння змоўклі, пераканаўшыся ў тым, што і дэмакратыі, і правоў чалавека ў Беларусі не менш, чым у іншых. А я пра гэта казаў заўсёды. І самае галоўнае — гэта права жыць. Нікому не патрэбна такая дэмакратыя, дзе кожны дзень на вуліцы страляюць і забіваюць за год сотні тысяч людзей». Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў грамадстве павінен быць парадак. «Ні ў якім разе — ніякага гвалту, ніякага здзеку з чалавека, ніякага прыніжэння чалавека», — сказаў кіраўнік дзяржавы. На яго думку, усё павінна быць для дабрабыту людзей.

Асобна Прэзідэнт закрануў і важнасць духоўнага развіцця грамадства, у якім вялікую ролю адыгрывае царква. «Сёння царква ў Беларусі ператварылася ў адно з апірышчаў нашай дзяржавы, якое забяспечвае разам з іншымі зацікаўленымі органамі ўлады і арганізацыямі баланс нашага грамадства, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Царква і нашы святары, як ніхто ў свеце, шмат зрабілі для міру і стабільнасці ў нашай дзяржаве». Па словах Аляксандра Лукашэнкі, улада ні ў якім разе не павінна залішне ўмешвацца ў справы царквы. «Царква больш чым іншая арганізацыя з'яўляецца самастойнай у нашай дзяржаве. І мы гэта падтрымліваем», — сказаў Прэзідэнт, адзначыўшы пры гэтым, што неабходна разумець: царква дзейнічае і функцыянуе ва ўмовах суверэннай і незалежнай дзяржавы. На яго думку, царква не павінна быць застылай, каб выконваць сваю функцыю, а павінна развівацца, удасканальвацца. Прэзідэнт заявіў, што нікому не будзе дазволена парушыць адзінства царквы.

Кіраўнік краіны адзначыў, што наступны год будзе няпростым — і не таму, што мы дрэнна працуем, не таму, што мы дзесьці чагосьці не бачым ці не ўмеем рабіць. «Свет змяняецца. А да зменлівага свету складана прыстасоўвацца — тое, што ёсць сёння, заўтра ўжо будзе іншым, — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. — Але той курс, які мы вызначылі, — гэта святое: абарона чалавека, стварэнне ўмоў для яго нармальнага жыцця. Таму вы не слухайце гэтыя размовы, паколькі заўсёды, калі складана, з'яўляюцца розныя тэорыі: рэфармаваць, разбурыць дашчэнту, затым новае нешта стварыць». Прэзідэнт заўважыў, што краіна ўжо перажывала гэта не аднойчы і таму нічога бурыць не будзем. «У нас шмат добрага. Дрэннае мы заўсёды адкідаем, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Так будзем жыць і далей. Але ўсё добрае мы будзем удасканальваць. Усё, што створана народам, мы нікому задарма прадаваць не маем намеру. Усё, што створана людзьмі, павінна належаць людзям».

Аляксандр Лукашэнка таксама сказаў, што «ўсё лепшае і каштоўнае, што ёсць у свеце, мы прыўнясём у нашу краіну і на гэта будзем абапірацца». Ён упэўнены, што Беларусь паспяхова пераадолее ўсе складанасці на шляху свайго развіцця, тым больш што яны не катастрафічныя для нашай дзяржавы. Беларусь і надалей мае намер праводзіць узважаную міралюбівую палітыку. Пры гэтым Прэзідэнт заявіў, што «мы нікому ні пядзі сваёй зямлі не аддадзім, гэта наша зямля, для нашых людзей, для нашых дзяцей».

Завяршаючы сваё выступленне, Аляксандр Лукашэнка адзначыў важнасць святкавання Раства Хрыстовага і Уваскрасення Хрыстовага. Разам з іншымі беларускімі святамі — гэта скарбніца маральнасці. «І мы будзем аб'ядноўвацца вакол нашых святынь, матэрыяльных, духоўных, для таго, каб захаваць наша адзінства», — запэўніў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы перадаў у дар Мітрапаліту Паўлу карціну «Віфлеемская зорка», зробленую беларускім майстрам. У сваю чаргу Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі падарыў Аляксандру Лукашэнку ікону з выявай Збавіцеля. Прэзідэнт разам са сваім малодшым сынам Мікалаем запаліў свечку ля іконы Мінскай Божай Маці.

# ТЭХАБСЛУГОЎВАННЕ СТАНЕ БОЛЬШ ПРАЗРЫСТЫМ,

## а старшыні таварыстваў уласнікаў — больш адказнымі

**Гэта прадугледжана ўказамі, якія падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.**

Указ №535 «Аб прадастаўленні жыллёва-камунальных паслуг» прадугледжвае раскрыццё самой «непразрыстай» паслугі — тэхнічнае абслугоўванне жылога дома. Яна падзяляецца на тры састаўныя: тэхнічнае абслугоўванне, прыборка дапаможных памяшканняў і асвятленне пад'ездаў.

Гэта дазволіць адказаць на пытанне аб рэальным кошце паслугі і перайсці да дыферэнцыяваных тарыфаў у залежнасці ад камфортнасці дома, яго паверхавасці. Такі падыход павысіць узровень кампенсацыі затрат насельніцтвам амаль да 80% без фактычнага павышэння кошту гэтай паслугі. У выніку эканамічны эфект будзе дасягнуты за кошт празрыстасці выдаткаў на тэхнічнае абслугоўванне жылых дамоў з дапамогай фарміравання кошту абслугоўвання 1 кв. метра на аснове тэхналагічных карт па серыях дамоў, а таксама аснашчэння жылых дамоў энергаэканомным абсталяваннем.

Акрамя таго, рэалізацыя Указа №535 забяспечыць своечасовае і рытмічнае фінансаванне арганізацый ЖКГ, што дазволіць абараніць іх у частцы своечасовых разлікаў бюджэту за паслугі, а таксама выключыць выпадкі, калі выканкамы скарачаюць запланаваныя гадавыя аб'ёмы фінансавання на рэканструкцыю, мадэрнізацыю і капітальны рамонт аб'ектаў ЖКГ. Нормы дакумента абавязваюць утрымліваць непрофільныя аб'екты толькі на платнай аснове, а не за кошт паслуг, якія аказваюцца насельніцтву, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Указ прадастаўляе магчымасць перайсці з цэнтралізаванага цеплазабеспячэння жыллёвага фонду грамадзян на індывідуальнае ацяпленне ў выпадках, калі першы варыянт эканамічна нявыгадны. Дакументам рэгламентаваны парадак такога пераходу. Ён будзе праводзіцца за кошт бюджэту, што дазволіць знізіць выдаткі мясцовых бюджэтаў, павысіць эканомію паліўна-энергетычных рэсурсаў, а таксама ажыццявіць перадачу цеплавых сетак і аб'ектаў знешняга асвятлення энергазабеспячальным арганізацыям.

Указ №536 «Аб унясенні змянення ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь» прадугледжвае комплексную карэкціроўку Указа ад 14 кастрычніка 2010 г. №538 «Аб некаторых пытаннях дзейнасці таварыстваў уласнікаў і арганізацый забудоўшчыкаў». Нормы дакумента накіраваны на павышэнне адказнасці старшыняў таварыстваў уласнікаў, арганізацый забудоўшчыкаў. Узмацняюцца патрабаванні да іх прафесійнай кваліфікацыі, пашыраюцца паўнамоцтвы мясцовых органаў улады па ўжыванні мер уздзеяння да нядобрасумленных старшыняў, выключаецца магчымасць прыняцця рашэнняў меншасцю ўласнікаў насуперак інтарэсам большасці.

Рэалізацыя Указа №536 дасць магчымасць упарадкаваць дзейнасць таварыстваў уласнікаў, арганізацый забудоўшчыкаў, пацягне зніжэнне выдаткаў на аказанне жыллёва-камунальных паслуг, забяспечыць сістэмны падыход да кіравання ЖКГ.

# НА ЛЁД — З ЛЮБОЎЮ

Чатырнаццаць матчаў, больш за сто семдзесят закінутых шайбаў і мора балельшчыцкіх эмоцый — Калядны турнір аматараў хакея на прызы Прэзідэнта скончыўся перамогай беларусаў

**Ужо па традыцыі спартыўны год у нашай краіне пачаўся з міжнароднага хакейнага турніру, на працягу некалькіх дзён на малой і вялікай пляцоўках «Чыжоўка-Арэны» не сціхалі спартыўныя баталіі. XII Калядны турнір стаў самым моцным за апошнія гады, упершыню ў фінал не прабілася каманда з Расіі, а лідзіруючае месца ў квартэце В занялі фіны, якія і паспрачаліся за перамогу з нашымі хакеістамі ў вырашальным матчы.**

Пра тое, што турнір будзе няпростым па напале барацьбы, стала зразумела з першага дня, бо хакеісты і трэнеры з розных краін у сваіх інтэрв'ю заявілі, што прыехалі не проста ўдзельнічаць, а перамагаць. Так і атрымалася: напружаныя, а часам нервовыя гульні заканчваліся з перавагай усяго ў адну шайбу. Так, на шляху да фіналу для хакеістаў каманды Прэзідэнта краіны самым складаным стаў матч супраць каманды са Славакіі, вырваць перамогу гаспадарам турніру атрымалася толькі ў канцы сустрэчы.

У апошні дзень турніру гледачы пачалі запаўняць «Чыжоўка-Арэну» яшчэ ўдзень, бо ў матчы за трэцяе месца сустрэліся вядомыя ў хакейным свеце дзяржавы — Швецыя і Славакія. Апошняя за гісторыю правядзення Каляднага турніру паспелі праславіцца статусам «вечна чацвёртыя», таму сёлета ў дружыны Юліуса Шуплера была дадатковая матывацыя. Як вынік разгром Трэ Крунур — 17:3. Славакі ўпершыню ў гісторыі правядзення турніру сталі ўладальнікамі бронзавых узнагарод.

Ну а ў фінале беларусы сустрэліся з грознымі фінамі. Пра ўзровень хакея ў краіне Суомі доўга расказваць не трэба. Маладзёжная каманда з гэтай паўночнай дзяржавы напярэдадні стала ўладальніцай залатых узнагарод сусветнага першынства, а нацыянальная зборная пастаянна трапляе ў «прызы» топ-турніраў. Вось і ў галоўным матчы калядных спаборніцтваў з першых хвілін аматары з Фінляндыі зрабілі гучную заяўку на поспех, закінуўшы шайбу ўжо на 5-й хвіліне сустрэчы. Гаспадарам усё ж удалося адыграцца, а пазней паразіць вароты гасцей яшчэ раз, што і прынесла перамогу камандзе з Беларусі. Аўтарам вырашальнай шайбы стаў Даніэль Корса.

— XII Калядны турнір запомніўся мне тым, што з'явіліся вельмі моцныя каманды, якія могуць спакойна гуляць у чэмпіянатах сваіх краін, у чэмпіянаце Беларусі ўжо дакладна. Гэта сведчыць аб тым, што турнір набывае ўсё большую папулярнасць. Ведаю намеры іншых каманд на наступны год выставіць яшчэ больш магутныя склады, напрыклад, трэнер славакаў Шуплер сказаў, што прывязе зноў моцную дружыну. Збіраюцца добрым складам і расіяне, — адзначыў **Аляксандр ЛУКАШЭНКА** пасля завяршэння фінальнай сустрэчы.

Таксама Прэзідэнт падкрэсліў, што менавіта цяперашні Калядны турнір з'яўляецца адным з самых запамінальных у гісторыі.

— Першы запомніўся, таму што ўсе хваляваліся, як усё пройдзе, ці атрымаюцца спаборніцтвы. А гэты запомніўся тым, што было цяжка нашай камандзе. Шчыра кажучы, не думалі, што пераможам. Было вельмі цяжка і ў фінале з фінамі, і ў групе са славакамі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.



Фота БЕЛТА.

Асобныя словы трэба сказаць заўзятарам, яны былі з камандай на працягу ўсіх спаборніцкіх дзён, падтрымлівалі не толькі сваіх хакеістаў, але і гасцей, і менавіта ад іх залежала тая цудоўная атмасфера, якая была ў Чыжоўцы. Нават пасля фінальнай сустрэчы, якая скончылася позна вечарам, людзі не спяшаліся разыходзіцца.

— Ведаю, што нават лішні білецік пыталіся на матч. Усе бачылі, як балельшчыкі перажывалі за вынік сустрэчы, ніхто не разыходзіўся да апошняй хвіліны, — распавёў кіраўнік дзяржавы.

Напрыканцы арганізатары назвалі найлепшых гульцоў турніру. Найлепшым варатаром прызнаны фін Томі Сатасаары, абаронцам — Андрэй Глебаў (Беларусь), нападаючым — Міраслаў Шатан (Славакія), найлепшым бамбардзірам XII Каляднага турніру стаў Марэк Урам (Славакія), які закінуў 7 шайбаў і зрабіў 15 галявых перадач.

Ну а пра тое, ці атрымаўся Калядны турнір з пункту гледжання арганізацыі, гавораць каментарыі гасцей з розных краін.

**Юліус ШУПЛЕР трэнер каманды Славакіі:**

— У Беларусі людзі любяць хакей, яны выдатна «хварэюць», таму ўражанні ад удзелу ў Калядным турніры добрыя. Хачу падзякаваць і гледачам і арганізатарам, і жадаю, каб такая атмасфера была ў вас заўсёды.

**Тэдзі САЛЮЦКІ, гулец каманды Фінляндыі:**

— Выдатна, што мы ўдзельнічаем тут. У мінулым годзе ў фінале былі расіяне, вельмі моцная каманда. Цяпер на іх месцы мы, што не можа не радаваць. На арэне выдатная атмасфера, і я спадзяюся, што прыеду сюды і ў наступным годзе.

**Магнус ПЕРСАН, трэнер каманды Швецыі:**

— Гэта выдатны турнір, дзякуй вам за тое, што запрасілі нас. Мы рады, што здолелі дайсці да гульняў за медалі, гэта і была нашай мэтай.

**Пітэр КЮНІ, гулец каманды Швейцарыі:**

— У дні правядзення Каляднага турніру каманда Швейцарыі атрымлівае асалоду ад знаходжання ў Мінску. Спаборніцтвы вельмі добра арганізаваны, нам вельмі падабаецца гэтая святочная атмасфера. Узровень камандаў у Мінску вельмі высокі, мне прыемна бачыць гульню некаторых хакеістаў, якія ў мінулым дамагаліся самых гучных перамог.

**Амар аль-ШАМІСІ, гулец каманды Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў:**

— Мы другі раз прымаем удзел у Калядным турніры, і гэтыя спаборніцтвы вельмі важныя для нас, таму што ў нашай краіне хакей з шайбай толькі набірае папулярнасць, яшчэ няма такіх багатых традыцый, як у вас. Вопыт, атрыманы на турніры, спатрэбіцца ў будучыні для развіцця гэтага займальнага віду спорту. У Беларусі хакей карыстаецца папулярнасцю, гэта мы бачым па трыбунах «Чыжоўка-Арэны», якія ў ходзе матчаў запоўненыя, а аматары гульні вельмі актыўна падтрымліваюць каманды.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
lobazhevich@zviazda.by

■ Тарыфы

# ЗМЯНІЛІСЯ ЦЭНЫ НА ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ І ГАЗ



**З першых дзён года тарыфы на газ і электрычнасць для насельніцтва павялічаны на 20%. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 5 студзеня №3 «Аб унясенні змен і дапаўненняў у пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2013 г. №1166».**

У дакуменце, у прыватнасці, гаворыцца, што з 1 студзеня тарыфы на паслугі па электразабеспячэнні і газазабеспячэнні павінны быць павялічаны на памер стаўкі ПДВ (на 20%), што і рэалізавана пастановай Савета Міністраў пры вызначэнні агульных падыходаў змены цэн (тарыфаў) на газ і электрычную энергію для насельніцтва.

Калі гаворка ідзе пра цану на газ, які выкарыстоўваецца з устаноўленымі прыборамі індывідуальнага ўліку расходу, то пры наяўнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў кошт аднаго «куба» газу ў ацяпляльны перыяд складзе 776,3 рубля, у летні перыяд — 2 842,2 рубля; пры адсутнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў — 2 842,2 рубля ў залежнасці ад перыяду, паведамляецца ў дадатку пастановы.

У выпадку выкарыстання газу без прыбораў індывідуальнага ўліку расходу цана з аднаго жыльца ў месяц складзе 22,6 тысячы рублёў пры наяўнасці газавай пліты і цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння або індывідуальнага воданагравальніка (за выключэннем газавага); 65,1 тысячы рублёў — пры наяўнасці газавай пліты і індывідуальнага газавага воданагравальніка (пры адсутнасці цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння). Пры наяўнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў цана на газ у ацяпляльны перыяд будзе дасягаць 3 242,4 рубля за 1 квадратны метр агульнай плошчы жылога памяшкання ў месяц, у летні перыяд — 1 215 рублёў. Кошт звадкаванага газу ў балонах вагой 21 кг у межах нормаў спажывання складзе 5 388,6 рубля за 1 кг, або 113,1 тысячы рублёў за адзін балон.

У жылых дамах (кватэрах) з электрапліткамі кошт электрычнасці па аднаставачным тарыфе складзе 1009,8 рубля за 1 кВт·г; па дыферэнцаваным тарыфе па часавых перыядах: з 22.00 да 17.00 (мінімальная нагрузка) — 706,8 рубля за 1 кВт·г, з 17.00 да 22.00 (максімальная нагрузка) — 2019,6 рубля. Электрычная энергія для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння з далучанай (сумарнай) магутнасцю абсталявання больш за 5 кВт у перыяд з 23.00 да 6.00 будзе каштаваць 1188 рублёў, у астатні час сутак — 3564 рублі. Кошт іншай электраэнергіі па аднаставачным тарыфе складзе 1188 рублёў; па дыферэнцаваным тарыфе па часавых перыядах: з 22.00 да 17.00 — 831,6 рубля, з 17.00 да 22.00 — 2376 рублёў.

Гэтай пастановай вызначаны тарыфы на камунальныя паслугі, якія забяспечваюць поўнае пакрыццё эканамічна абгрунтаваных затрат на іх аказанне. Цяпер кошт цеплавой энергіі для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння складзе 854 710,31 рубля за Гкал. Тарыф за адзін кубічны метр прыроднага газу, што выкарыстоўваецца з устаноўленымі прыборамі індывідуальнага ўліку расходу, складзе 3 738,1 рубля; без прыбораў індывідуальнага ўліку расходу газу: пры наяўнасці газавай пліты і цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння або індывідуальнага воданагравальніка (за выключэннем газавага) — 29 900 рублёў з аднаго жыхара ў месяц, а пры наяўнасці газавай пліты і індывідуальнага газавага воданагравальніка (пры адсутнасці цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння) — 86 000 рублёў, пры наяўнасці газавай пліты і адсутнасці цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння і індывідуальнага газавага воданагравальніка — 48 600 рублёў. Кошт электрычнай энергіі па аднаставачным тарыфе складзе 1 900 рублёў за 1 кВт·г, па дыферэнцаваным тарыфе па часавых перыядах: з 22.00 да 17.00 — 1 330 рублёў за 1 кВт·г, з 17.00 да 22.00 — 3 800 рублёў.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■

## БЕЗНАЯЎНЫЯ ЖЫЛЛЁВЫЯ СУБСІДЫІ

планууецца ўвесці для аплаты жыллёва-камунальных паслуг

«З мэтай дзяржаўнай падтрымкі сацыяльна ўразлівых грамадзян у цяперашні час урадам вырашаецца пытанне аб увядзенні безнаяўных жыллёвых субсідый для аплаты часткі жыллёва-камунальных плацяжоў пры іх перавышэнні пэўнай долі сукупнага даходу сям'і», — адзначылі ў прэс-службе ўрада.

Для спрашчэння прадастаўлення насельніцтву такіх субсідый прадугледжваецца стварэнне на базе АРІП (адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы) агульнарэспубліканскай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы па разліку за жыллёва-камунальныя паслугі і базы даных аб даходах і маёмасным становішчы грамадзян.

«Гэта дазволіць налічваць безнаяўныя жыллёвыя субсідыі грамадзянам, якія маюць патрэбу ў гэтым, без збору і прадастаўлення імі неабходных дакументаў», — растлумачылі ў прэс-службе.

■ Надвор'е

## У ПАНЯДЗЕЛАК МАГЧЫМЫ СУР'ЁЗНЫ СНЕГ

**А на выхадныя сіноптыкі прагназуюць даволі няўстойлівае надвор'е, калі на поўначы краіны будзе яшчэ істотна марозіць, а па паўднёвым захадзе месцамі чакаецца нават плюсавая тэмпература, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**

У суботу амаль паўсюдна пройдзе кароткачасовы снег. У Брэсцкай вобласці — снег, мокры снег, наліпанне мокрага снегу. На некаторых участках дарог галалёдзіца. Вецер паўднёва-ўсходні слабы. Пацяплее. Тэмпература паветра ўдзень будзе вагацца ад нуля на паўднёвым захадзе да мінус 14 на паўночным усходзе Беларусі. Праўда, у нядзелю зноў чакаецца невялікае пахаладанне. Уначы на нядзелю пахаладае да мінус 12-16 градусаў, а па поўначы пры праясненнях — да 22 марозу. Удзень будзе ад мінус 4 да мінус 15 градусаў.

Ужо ўначы на панядзелак асобныя метэасайты пачалі прагназаваць снег, а месцамі і моцны снег з узмацненнем ветру і пагаршэннем умоў надвор'я. Гэтую інфармацыю пацвердзіў дзяжурны сіноптык Белгідраметцэнтра. «Пакуль моцных снегападаў не прагназуецца, — удакладніў ён, — аднак іх верагоднасць існуе».

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*



■ На слыху

# БЯДА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦІ НЕ МАЕ

**У вёсцы Патапаўка, што на Буда-Кашалёўшчыне, у першыя дні новага года здарылася трагедыя. У агні загінулі двое малалетніх дзяцей і жанчына. Усе — грамадзяне Украіны. Прыкладна год таму сям'я прыехала сюды з горада Днепрадзяржынска Днепрапятроўскай вобласці і купіла дом у беларускай вёсцы. Сям'я — гэта 57-гадовы гаспадар, яго жонка, на дваццаць гадоў маладзейшая, і іх трохгадовы сын. Да таго ж жыць разам з дзедам сталі і дзве ўнучкі, якіх ён забраў з інтэрната. (Іх маці, дачка гаспадара, была пазбаўлена на радзіме правоў на выхаванне дзяцей.)**

Мужчына не паспеў афіцыйна аформіцца апекуном сваіх унучак. Гэта трэба было рабіць ва Украіне, і каштавала працэдура вялікіх грошай, таму дзяўчынкі жылі ў Беларусі без неабходных дакументаў. Увогуле ж сям'я не давала падстаў, каб хвалявацца за іх жыццё. У доме было заўсёды прыбрана і ўтульна.

Так супала, што напрыканцы кастрычніка мы гутарылі (30.10.2015 «Да зімы... не падрыхтаваліся») з **кіраўніком справамі Патапаўскага сельвыканкама Аленай ДЗЕМЯНКОВАЙ** наконт традыцыйнага прафілактычнага абследавання ўсіх катэгорый грамадзян: шматдзетных, адзінокіх, адзінока пражываючых і так званай групы рызыкі. Тады яна сказала:

— Некаторых наведалі па два разы. Там, дзе былі заўвагі, правяралі, ці выкананы папярэднія рэкамендацыі. У асноўным людзі замазвалі расколіны печак, некалькі чалавек перараблялі грубкі і праводку новую зрабілі. Дапамогу на правядзенне гэтых работ мы людзям аказвалі праз сацыяльныя службы — у сельсавеце для гэтага сродкаў няма і гаспадарка наша не здольна дапамагчы.

Цяпер Алена Пятроўна дадае, што ў сям'і, дзе здарылася трагедыя, таксама летась пабывалі ратавальнікі і прадстаўнікі мясцовай улады:

— Ніхто там гарэлку не піў і не курыў. Мужчына працуе ў мясцовым сельгаспрадпрыемстве і пастаянна выконвае розныя работы па заданнях сельвыканкама. Адносіны паміж сужэнцамі былі вельмі добрыя. Гаспадар ветлівы, спакойны. Не ведаю, як будзе жыць надалей. Не засталося ні сваякоў, ні дакументаў, ні дома. Гора.

Дарэчы, назіральная камісія летась двойчы наведала гэтую сям'ю. Двойчы, у чэрвені і ў лістападзе, ім было рэкамендавана набыць і ўсталяваць аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі. Тым не менш наўрад ці іх наяўнасць магла б выратаваць людзей у той надзвычайнай сітуацыі. **Першы намеснік начальніка Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей МЯЛЕШКІН** расказвае гісторыю трагічнай ночы на 4 студзеня са слоў гаспадара дома:

— Яго разбудзіла жонка, сказала, што гарыць хата. Ён адчыніў дзверы на веранду, убачыў полымя, пасля чаго пачаў ратаваць сваіх блізкіх, але гэтыя дзеянні прывялі да смяротнага зыходу. Ён выламаў супрацьлеглыя дзверы, утварылася цяга і агонь пайшоў па ўсёй хаце. З яго слоў, пажар пачаўся на верандзе, дзе знаходзіліся грубка, якую ён нядаўна пабудаваў для ацяплення, і электрычная печка, якую прывёз з Днепрапятроўскай вобласці.

Сусед Аляксей Аніськоў першым патэлефанаваў ратавальнікам:

— Я прачнуўся ноччу, выйшаў выпусціць сабаку. Убачыў, што гарыць дом, апрануўся і пайшоў туды. Людзей відаць не было. Я пачаў тэлефанаваць 101. Ведаў, што там жыве вялікая сям'я... Падышоўшы бліжэй, убачыў гаспадара. Спытаў — дзе астатнія? Ён сказаў, што «там». У гэты час падышоў яшчэ адзін сусед... Гаспадар папрасіў нешта абуць — ён быў босы, ногі акрываўленыя. Пайшоў у дом, а нам перадаў дзіця. Палажылі на куртку і аднеслі да суседа. Калі вярнуліся, увесь дом быў ахоплены полымем.

Гаспадар сям'і выжыў. Трое яго родных — жонка з маленькім сынам і малодшая 9-гадовая ўнучка загінулі ў полымі. Іх ратавальнікі знайшлі на падлозе ў пакоі пасля тушэння пажару. Старэйшая 12-гадовая ўнучка цяпер знаходзіцца ў рэанімацыі ў Гомелі — у яе тэрмічныя апёкі 2-3 ступені амаль што паловы цела.

**Намеснік старшыні Буда-Кашалёўскага райвыканкама Генадзь ВАМБРЫКАЎ** расказаў, што для мужчыны, які выжыў, знайшлося часовае жыллё. Грамадзянам Украіны не могуць быць выдадзены тыя дапамогі, якія атрымліваюць на пахаванне сваякоў мясцовыя жыхары. Таму ў сельсавеце самі вырашылі дапамагчы пацярпелым. Мясцовыя прадпрыемствы і звычайныя людзі ў гэтай трагічнай сітуацыі не толькі выказваюць шчырыя спачуванні — арганізаваны збор сродкаў на пахаванне загінулых.

**Адпаведная камісія высвятляе дакладныя прычыны трагедыі. Спецыялісты МНС і Следчага камітэта праводзяць неабходныя экспертызы. Афіцыйнага заключэння пакуль няма. Ёсць версіі, што ўзгаранне магло адбыцца праз няспраўнасці праводкі ці печы.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■

**ООО «Центр эксперт-услуг» (Организатор аукциона) проводит открытый аукцион по продаже**
**ОДНОЭТАЖНОГО КИРПИЧНОГО ЗДАНИЯ ДИСПЕТЧЕРСКОЙ (здания неустановленного назначения)**
**с инвентарным номером 350/С-135708 общей площадью диспетчерской – 8,4 кв.м**
**(составные части: мастерская площадью застройки – 66 кв.м, металлические ворота),**
**расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Комсомольская, 3а,**
**на земельном участке площадью 0,0111 га, предоставленном на праве аренды, сроком по 07.04.2019 г.**

**Начальная цена – 300 006 000 бел. рублей с НДС.**
**Шаг аукциона – 5% начальной стоимости объекта.**
**Задаток – 10 000 000 бел. рублей.**

*Задаток перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет 3012403517013 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 400 г. Гомель, МФО 153001749, УНП 491058984, получатель платежа ООО «Центр эксперт-услуг», назначение платежа: задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 09.01.2016 г.*

Перечень документов, необходимых для участия в аукционе, порядок проведения аукциона и оформления его результатов, дополнительная информация об Объекте аукциона размещены на сайте **standard.by.**

Переход права аренды на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством.

Победитель аукциона обязан: в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона возместить затраты продавца на организацию и проведение аукциона (расходы на публикацию обязательных извещений и рекламных материалов). Размер такого возмещения не должен превышать суммы фактических затрат на организацию и проведение аукциона, а также включать затраты по ранее проведенным нерезультативным, несостоявшимся аукционам в случае повторного выставления объекта на торги и определяется на основании представленных Организатором аукциона документов; в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона заключить с продавцом договор купли-продажи объекта недвижимости (далее договор купли-продажи); произвести оплату в сроки, установленные договором купли-продажи; если в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект недвижимости, в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи произвести оплату за объект недвижимости.

**Аукцион состоится 12 февраля 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 9 февраля 2016 г. до 16.00 по указанному адресу.**

**Тел.: 8 0232 21 21 61, + 375 29 685 49 86. E-mail: 6854986@standard.by**

■ Здарэнне

## ТРАКТАР ЗАГЛУХ ПЕРАД ЦЯГНІКОМ

**У Дзяржынскім раёне адбылося сутыкненне пасажырскага поезда і трактара. Здарэнне мела месца на чыгуначнай станцыі «Станькава».**

Як паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, ранкам кіроўца трактара «МТЗ» з прычэпам выехаў на чыгуначны пуці да таго, як уключыўся сігнал святлафора, што забараняе рух. І ў гэты момант транспартны сродак заглух, бо замерзла дызельнае паліва. У выніку адбылося сутыкненне з пасажырскім цягніком №131 Масква — Брэст, які ехаў з Мінска ў абласны цэнтр. Трактар і цеплавоз атрымалі механічныя пашкоджанні. На шчасце, ніхто не пацярпеў. Работнікам МНС давялося вызваляць чыгуначныя пуці ад пашкоджаных частак «МТЗ». Са сталіцы накіравалі цеплавоз для буксіроўкі пашкоджанага «сабрата» на запасны пуць. Праз гадзіну пасажырскі поезд прадоўжыў рух у Брэст. Затрымка ў курсіраванні трох іншых цягнікоў склала ад гадзіны да паўтары.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ЯДНАЕ СВЯТА РАСТВА







**У светлае свята Раства Хрыстовага Мінскі Свята-Духаў кафедральны сабор прыняў пяцьсот хлопчыкаў і дзяўчынак з розных гарадоў і вёсак Беларусі, а таксама іх аднагодкаў з блізкіх раёнаў Расіі і Украіны.**

**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Павел разам з вядомымі грамадскімі дзеячамі, артыстамі сустрэў дзятву, павіншаваў са святам, уручыў падарункі і перадаў маленькім гасцям пажаданні ўсяго найлепшага ў жыцці. Дзеці ж у знак падзякі выступілі са сваімі творчымі віншаваннямі і падарылі торт, на якім гарэлі 22 свечкі — столькі гадоў споўнілася сёлета рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Калядная ёлка — нашы дзеці». Гэты праект аб'ядноўвае больш за паўтары тысячы дзяцей з Беларусі, Расіі і Украіны. Арганізатарамі яго з'яўляюцца Дэпартамент па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», Епархіяльнае ўпраўленне Беларускай Праваслаўнай Царквы, Беларускі фонд Міру.**

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.**



■ Справы духоўныя

## МОШЧАМ АПОСТАЛА АНДРЭЯ ПЕРШАЗВАННАГА

### цяпер можна пакланіцца ў Мінску

Днямі святыня была прынесена ў сталічны храм імя дабравернага князя Аляксандра Неўскага Беларускай Праваслаўнай Царквы. Як паведамілі «Звяздзе» ў храме, у дзень прыняцця мошчаў, 8 студзеня, была адслужана Літургія, і цяпер вернікі ў любы час працы Аляксандра-Неўскай царквы (Вайсковыя могілкі) могуць іх наведаць. Часцінка мошчаў апостала Андрэя Першазваннага будзе і надалей захоўвацца ў храме.

Святыня прыбыла ў беларускую сталіцу з грэчаскага вострава Корфу. Мошчы з'явіліся там у 1537 годзе. Іх прынеслі з Ерусаліма ў мясцовы храм свяціцеля Мікалая. Цяпер, па блаславенні мітрапаліта Керкірскага, Паксійскага і Дыяпанційскіх астравоў Нектарыя яна даступна для пакланення і праваслаўным беларусам. «Звязда» з нагоды прынясення часцінкі высветліла, ці адрозніваюцца па сваёй сіле мошчы апостала ад мошчаў іншых святых, і каму з вернікаў лепей звяртацца да Андрэя Першазваннага.

— Мы не вымяраем мошчы па сіле благадаці, як навукоўцы радыеактыўныя элементы па перыядзе паўраспаду: у адных больш, у іншых менш, — расказаў **протаіерэй Сергій ЛЕПІН, старшыня Сінадальнага інфармацыйнага аддзела Беларускага Экзархата.** — Бо «не мераю дае Бог Духа», як сказана ў Евангеллі. У той жа час дар Духа Святога ў кожным з нас праяўляе сябе па-свойму. Таму чалавек, у якіх бы жыццёвых абставінах ён ні знаходзіўся, можа адшукаць прыклад для пераймання ў таго ці іншага святога. З большай верагоднасцю настаўнікі ўбачаць натхняльны прыклад у тых святых, хто навучаў іншых ва ўлонні Царквы. Дактары — у подзвігу святых-лекараў. Хворыя людзі — у тых, хто таксама меў пэўныя захворванні і мужна іх прымаў. У кожнага ёсць святыя, якія бліжэй па тых ці іншых прычынах і натхняюць сваім жыццём болей за астатніх.

Айцец Сергій тлумачыць, што ўсе святыя маюць царкоўныя чыны: прарокі, апосталы, свяціцелі, прападобныя... Усяго іх каля дзясятка. Гэтыя групы вылучаюцца ў залежнасці ад таго, як жыў чалавек, чым ён праславіўся, чым дагадзіў Богу. «Але святасць ва ўсіх іх адна — Хрыстова. Толькі спосаб яе рэалізацыі ў кожнага свой», — кажа ён.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# КАЛЯДАВАЦЬ — ДЫК З «БУКЛЕЕМ»!



**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Буклей робяць з дрэва і паперы, носяць на невялікім кійку, а ў цэнтры канструкцыі робяць маленькі лялечны тэатр — круцяць папяровыя фігуркі чалавечкаў, звяроў, дамкоў, елак. А яшчэ запальваецца свечка і асвятляе праз экран — матавую кальку — усё батлеечнае дзейства. Гэты незвычайны міні-тэатр па-даўнейшаму называецца «конікі». Буклеі з «конікамі» спецыяльна рабілі, каб стварыць святочны настрой для дзяцей. Ды і сучасныя дзеці з задавальненнем углядаюцца ў цёмныя вокны і дзівяцца, убачыўшы папяровыя махры каляднай зоркі-буклея і прывідныя лялечныя фігуркі «конікаў».

Мясцовы жыхар, будаўнік Іван Ільючык, ужо дзесяць гадоў носіць багданаўскую зорку ў свята, віншуе суседзяў, блізкіх і далёкіх аднавяскоўцаў — на чатыры кіламетры выцягнулася гэтая вёска сярод колішніх балот.

— Калі я бачу, колькі людзей рыхтуюцца і робяць буклей, выходзяць з імі ў святыя вечары, мая душа перапаўняецца радасцю: яшчэ 20 гадоў таму людзі амаль забылі традыцыйнае калядаванне, — кажа Іван Ільючык. — Багданаўка не падобная да іншых вёсак у сваёй адметнай традыцыі, і таму трэба яе захаваць.

Тры дні гуляюць Каляды ў Багданаўцы, ходзяць у госці: дзеці наведваюць бацькоў, унукі не забываюць дзядоў і бабак. У хатах іграюць гармонікі, спяваюцца традыцыйныя застольныя песні ў сваёй непаўторнай багданаўскай манеры. Дырэктарка вясковага клуба Галіна Кавалевіч сабрала свой фальклорна-этнаграфічны гурт, жанчыны ўселіся на калёсы (снегу ў вёсцы амаль няма) і паехалі ў самую вясковую глыбінку Маркавічы (Багданаўка складаецца з некалькіх «мікраёнаў») — тут жывуць захавальнікі сапраўднага палескага побыту і культуры — бондары, печнікі, пчаляры, вышывальніцы, сталяры, паляўнічыя і проста дбайныя гаспадары.

З суседняй вёскі Вулька Першая (гэты населены пункт знаходзіцца за 20 кіламетраў) прыехалі пакалядаваць і павесяліцца касцюмаваныя ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці — з зоркай, «казой», «мядзведзем», «цыганкай», Дзедам Марозам і Снягуркай. Сярод багданаўскіх буклей госці выглядалі трошкі тэатральна, але ўсё роўна стваралі святочны і вясёлы настрой.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**







# ГІСТОРЫІ ДЛЯ ЎСІХ І КОЖНАГА

## З ПРЫГОДАМІ, ЦУДАМІ І АТМАСФЕРАЙ ДЗЯЦІНСТВА

**Мультфільмы — магчымасць узняць настрой зімовым вечарам, сабраўшыся на канапе ўсёй сям'ёй. Любяць іх аднолькава і дарослыя, і дзеці. Мульцікі вяртаюць нас у тыя часы, дзе ўсё проста, надзейна і добра заканчваецца: прынцэса абавязкова сустракае свайго прынца, мамантяня знаходзіць маму, а сяброўства доўжыцца ўсё жыццё. Сёння выбар мультыплікацыйных фільмаў настолькі разнастайны, што сучасных дзяцей здзівіць даволі складана. І перавагу часам яны аддаюць менавіта замежным стужкам. Але не лішне будзе нагадаць, што і сярод нашых, беларускіх, ёсць вартыя ўвагі.**

Першым мультфільмам, знятым у 1972 годзе на «Беларусьфільме», быў **«Два погляды на адно і тое ж»** Уладзіміра Голікава і Марты Лу-



бянікавай. Ён з'яўляўся рэкламным, рабілі яго для беларускай ДАІ. Працоўны тандэм гэтых двух рэжысёраў існаваў працяглы перыяд. (Яны пазнаёміліся, калі Марта Аляксандраўна іграла ў народным тэатры, куды Уладзімір завітаў з тэкстам уласнай п'есы.) Лубянікава з часам захапілася мультыплікацыяй і стала асістэнткай рэжысёра. Яе першы лялечны мультфільм — **«Цімка і Дзімка»**, 10-хвілінная гісторыя аб



працавітым кацяняці і лежабоку-мядзведзіку і ў наш час вельмі актуальная. Тут гучыць многім вядомая песня «Дружба моцная...», а яшчэ можна пабачыць практычныя парады кшталту: як данесці малако, каб лягчэй і не разлілося, як злавіць мышку, і ўбачыць — якое яно, сапраўднае сяброўства...

Добрай атрымалася варыяцыя на тэму дружбы ў мультфільме **«Светлячок і расінка»** ад рэжысёра Юрыя Бутырына, знятым паводле



казкі Максіма Танка. Маляваны мульцік, з'явіўшыся на савецкіх экранах 1 студзеня 1978 года, стаў легендай беларускай анімацыі. Гісторыя пра сяброўства Светлячка і Расінкі атрымалася вельмі пазітыўнай, добрай і глыбокай па сэнсе. Незалежна ад таго, паглядзіце вы яе раніцай ці вечарам перад сном, добры настрой гарантаваны. Кампазітар Леанід Захлеўны спецыяльна для фільма напісаў песеньку «Няўжо такое было?» (яе выконваюць Сяргей Іваноў і беларуская актрыса тэатра і кіно Рэгіна Дамброўская). Мультфільм знялі як музычную фантазію па матывах казкі Максіма Танка пра Светлячка, які кожную ноч прачынаўся, калі ўсе кляліся спаць, і запальваў па ўсім лесе зоркі і агеньчыкі, а раніцай вяртаўся дадому і кляўся спаць. Але аднойчы ён заўважыў у траве Расінку... Абавязкова знайдзіце час паглядзець гэты цудоўны мульцік і ўбачыце, што навокал нас штохвіліна здараюцца цуды. Варта толькі іх разгледзець.

А вось даведацца, як рыхтаваліся да зімы ў лесе бычок, авечка, дзік і певень, можна падчас прагляду мультфільма **«Зімоўе звяроў»** (Беларусьфільм, 1999 год, рэжысёр



А. Ленкін). Сабраліся яны ў адной кампаніі, каб лета шукаць. А калі надышла зіма, то бычок прапанаваў будаваць хатку, але яго ідэю ніхто не падтрымаў. А потым, як у той казцы пра рукавічку, усе па чарзе пачалі прасіцца да яго пагрэцца. І не страшныя ім былі любыя маразы і завеі, але...

Калі ж вашы дзеці цікавяцца насельнікамі рэчак і азёр, то ім, верагодна, спадабаецца мультфільм **«Рыбка з імем Нельга»** ад таго ж Аляксандра Ленкіна. Мульцік складаецца з пяці фільмаў, якія выходзілі з 2011 па 2014 год.



Гісторыя пра карасіка не толькі з'яўляецца захапляльным падарожжам па падводным свеце, але і мае шмат павучальных парад, якімі можна карыстацца на практыцы. Напрыклад, дзе нельга пакідаць смецце, як варта паводзіць сябе, каб пазбегнуць небяспекі, і якія наступствы чакаюць, калі парушаеш правілы. Паразважаць будзе пра што і дарослым, і дзецям.

Хочацца парэкамендаваць для прагляду яшчэ адзін цудоўны мультфільм — **«Дзед»**, зняты тым жа Ленкіным. Ужо ў першыя дні пасля з'яўлення фільма ў сецiве ён назбіраў больш за тысячу праглядаў. У аснову сюжэту пакладзена вядомая беларуская казка, дзе расказваецца пра старадаўні звычай адпраўляць старых людзей паміраць у лес ці сплаўляць на чаўне па рацэ, каб дарма хлеб не елі. Але ў адной сям'і вельмі паважліва ставіліся да старых і пайшлі на падман,



схаваўшы бацьку, а замест яго ў лодцы адправілі пудзіла. І такі ўчынак выратаваў усіх жыхароў гэтай вёскі, бо жыццёвы вопыт пажылога чалавека дапамог людзям перажыць страшны голад... Мультфільм «Дзед» — гэта добры жыццёвы ўрок для кожнага, ён вучыць шанаваць, клапаціцца і прыслухоўвацца да старэйшага пакалення.



А тых, хто любіць прыгоды, парадуе фільм **«Прыгоды Несцеркі»**. Ён выйшаў у 2013 годзе і з'яўляецца першым беларускім маляваным поўнаметражным мультфільмам, знятым рэжысёрам Ігарам Воўчакам. Восем захапляльных гісторый пра героя народных легендаў і паданняў ствараліся не адзін год (першы фільм убачыў свет у 2003 годзе). Несцерка і яго верныя кот і сабака здольны знайсці выйсце з любой сітуацыі: ведаюць, як справіцца з Ліхам у хаце, могуць з глінянага гладыша зрабіць музычны інструмент і шмат чаго іншага... У іх кампаніі ніхто не засумуе.

Ёсць у нашых мультыплікатараў добры варыянт і для тых, хто цікавіцца гісторыяй — фільм **«Аповесць мінулых гадоў»**. 13-хвілінныя мікраметражныя апавяданні пра паходжанне і сімволіку гербаў беларускіх гарадоў. Ужо створана сем выпускаў (першая частка была прадстаўлена ўвазе гледачоў у 2007 годзе). Гісторыі ствараліся рознымі аўтарамі, таму крэатыўны падыход і разнастайнасць поглядаў прыемна радуе і можа зацікавіць шырокую аўдыторыю.



Спіс гэты можна працягваць бясконца... Той, хто паглядзіць названыя мультфільмы, магчыма, пажадае працягу і тады пераканаецца, што беларускія мульцікі — гэта сапраўдная скарбніца неверагодных гісторый, якія ніколі не пакінуць абыякавым. Прыемнага вам прагляду!

### ЦІКАВА ВЕДАЦЬ:

- **Першыя мультфільмы былі «нямымі» і чорна-белымі.**
- **6 красавіка 1906 года свет убачыў нямы мультыплікацыйны фільм «Камічныя фазы смешных твараў» амерыканца Джэймса Блэктана, які многія гісторыкі мультыплікацыі лічаць першым.**
- **У гэтым жа годзе балетмайстар Марыінскага тэатра Аляксандр Шыраеў стварыў першы ў свеце лялечны мультфільм (у ім 12 фігурак танцуюць на фоне нерухомых дэкарацый), ён быў зняты на 17,5-міліметровую плёнку за тры месяцы.**
- **Летам 1936 года ў Маскве была створана студыя мультыплікацыйных фільмаў «Саюзмультфільм», дзе знялі больш за 1500 мультфільмаў.**
- **Каб стварыць, напрыклад, 10-хвілінны мультфільм, спатрэбіцца каля 15 тысяч малюнкаў. А для аднаго руху персанажа трэба зрабіць больш за сотню малюнкаў.**
- **Найлепшым мультфільмам усіх часоў па выніках апытання 140 кінакрытыкаў і мультыплікатараў розных краін у 2003 годзе быў прызнаны «Вожык у тумане» (СССР, 1975).**
- **Першым поўнаметражным фільмам, які змадэлявалі на камп'ютары цалкам трохмерным, стаў мульцік «Гісторыя цацак» (ЗША, 1995), і яго выканаўчым прадзюсарам быў сам Стыў Джобс.**

■ Баю-бай!..

## «КАЛЫХАНКА» АДЗНАЧЫЛА ЮБІЛЕЙ

**Адзін з найстарэйшых праектаў беларускага тэлебачання і ў той жа час праграма, якая застаецца заўжды маладой, бо разлічана на дзіцячую аўдыторыю, 1 студзеня адзначыла сваё 35-годдзе.**

Новы 2016 год беларусы сустрэлі вялікім юбілеем нацыянальнага тэлебачання, якое існуе 60 гадоў. За гэты час было падрыхтавана шмат дзіцячых праектаў, але, без сумнення, першай праграмай, што ўзгадае кожны, будзе «Калыханка». Дзед Барадзед, хлопчык Бульбінка, сабачка Цява і Дзядуля Лесавічок — гэта далёка не поўны спіс герояў, на якіх вырастала не адно пакаленне хлопчыкаў і дзяўчатак.

«У 1981 годзе мы хацелі стварыць вячэрнюю казку, максімальна не падобную да «Спокойной ночи, малыши!», якая мела б нацыянальны каларыт», — падзялілася ўспамінамі стваральніца «Калыханкі» Ніна Вячаславаўна Шоба, якая доўгі час была галоўным рэдактарам праграм для дзяцей і юнацтва. Менавіта яна падала ідэю першай беларускай вячэрняй казкі для дзяцей, прыдумала канцэпцыю праграмы і назву «Калыханка». Разам з вялікай камандай — у першую чаргу з Верай Руцкай, Людмілай Тарасавай, Леанідам Качанкам, Аленай Фурсавай — яна ажыццявіла сваю арыгінальную задумку.

Аднымі з першых персанажаў «Калыханкі» былі жартаўнік і казачнік Бай, а сярод лялек — Буслік. Дарэчы, 1 студзеня Буслік вярнуўся на тэлеэкраны з доўгага падарожжа (ці гэта ўжо хутчэй яго праўнук?). Ён зноў забаўляе маленькіх гледачоў канала «Беларусь 3» разам з лісічкай Янай (Інай Ганчар) і медзведзяняткам Тапам (Уладзімірам Варанковым). Калі раней лялечных герояў агучвалі супрацоўнікі дзіцячай рэдакцыі Беларускага тэлебачання, то сёння гэта робяць прафесійныя акцёры, і Буслік загаворыць голасам актрысы Эміліі Пранскутэ, якая раней агучвала ў «Калыханцы» Сплюшыка.

Адпраўляе хлопчыкаў і дзяўчатак у чароўны свет казкі зладжаная прафесійная каманда: Фея Сноў (Алена Бікранёва), Дзед Дабрадзей (Валянцін Салаўёў), вандроўнік Нестар (Сяргей Жбанкоў) і нянька Палінка (Таццяна Чардынцава). Рэдактары ўвесь час знаходзяцца ў творчым пошуку, выдумляюць разнастайныя цікавыя формы падачы матэрыялу, ствараюць новыя дэкарацыі. Героі «Калыханкі» таксама ўвесь час абнаўляюцца, бо праграма крочыць разам з сучаснымі дзецьмі, якія выдатна разбіраюцца ў найноўшых камп'ютарных тэхналогіях і, вядома, мультыплікацыі.

У студзені канал «Беларусь 3» пачне паказваць 12-серыйны мультсерыял «Продкі», вытворцамі якога з'яўляюцца маладыя беларускія аніматары. Стваральнікі «Калыханкі» ўпэўнены, што новы мультфільм прыйдзецца даспадобы маленькім гледачам.

— Мы набывалі серыял на рускай мове, але агучваем яго па-беларуску, што стане падарункам для дзетак да юбілею «Калыханкі». Для нашых прыхільнікаў падрыхтавана шмат сюрпрызаў. Напрыклад, у канцы студзеня плануем адкрыць выставу, прысвечаную 35-годдзю любімай праграмы ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі, куды абавязкова запросім нашых гледачоў. Падчас выставы будзе паказаны відэафільм пра гісторыю «Калыханкі», створаны Белтэлерадыёкампаніяй, — расказала выканаўчы прадзюсар тэлеканала «Беларусь 3» Ларыса Есарція.

«Калыханка» шчыра віншуе сваіх маленькіх і дарослых гледачоў з цудоўнымі зімовымі святамі і зычыць усяго самага добрага!

Матэрыялы паласы падрыхтавала
**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*

## Аўторак, 12 студзеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.05** Зона Х.
**9.10 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**10.50 Серыял «Крыху не ў сабе».**
**12.10, 16.40 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.10** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «А шчасце дзесьці побач».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.10 Серыял «Не жаночая справа».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20, 23.20** Сфера інтарэсаў.
**20.00, 1.05 Серыял «Снайперы. Каханне пад прыцэлам».**
**21.00** Панарама.
**21.45** Цырымонія ўручэння прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларускі спартыўны Алімп» 2015 года.
**23.55** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 17.30** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**9.35, 22.10** «Арол і Рэшка». Трэвел-шоу.
**10.35, 16.30 Трылер «Закрытая школа».**
**11.30, 21.10** «Чалавек-нябачнік». Рэаліці-шоу.
**12.30, 18.05 Серыял «Варонiны».**
**13.30, 20.05 Серыял «Шурачка».**
**14.30, 19.05 Серыял «Кухня».**
**15.30, 23.55** «Разбуральнікі міфаў».
**22.05** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.05 Серыял «Косці».**
**0.50 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

### Беларусь 3

**7.20, 12.55, 17.15, 23.30** «Калейдаскоп».
**7.35** «Сусветная карцінная галерэя».
**8.05, 19.50** «Кліч продкаў». Серыял.
**9.45** «Славянскі базар-2010». Творчы вечар народнага артыста СССР Раймонда Паўлса.
**11.00** «Камертон». Раймонд Паўлс.
**11.30 «Крыніцы». Драма.**
**13.10 «Ясь і Яніна». Камедыя.**
**14.15, 23.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці скульптара, народнага мастака СССР Заіра Азгура.
**14.40 «За што?» Драма.**
**17.30 «Сем тон долараў». Камедыя.**
**18.55** «Маладыя таленты Беларусі. Класіка».
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Легенды беларускай эстрады».
**21.30** «Маладзечна 2012». Рок-опера «Курган» і канцэрт Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі.

### Беларусь 5

**7.30** PRO спорт. Вынікі.
**8.00** Тэніс. Турнір WTA. Сідней.
**12.00** Хакей. Белнафтахім — чэмпіянат Беларусі. Другі этап. «Юнацтва Мінск» — «ХК Гомель».
**13.55** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Лакаматыў» (Яраслаўль).
**15.45** Спорт-мікс.
**16.05** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**16.30** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Гонка пераследу. Жанчыны.
**17.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Гонка пераследу. Мужчыны.
**18.20** Спорт, спорт, спорт. Станіслаў Леута.
**18.50** Спорт-кадр.
**19.20, 22.00** PRO спорт. Навіны.
**19.25** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/2 фіналу. Першы матч. «Лукко Раума» (Фінляндыя) — «Кярпят» (Фінляндыя).
**21.45** «Нашы». Уладзімір Самсонаў.
**22.10** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/2 фіналу. Першы матч. «Давос» (Швейцарыя) — «Фрэлунда» (Швецыя).

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.15, 13.10, 22.45 Серыял «Усмешка перасмешніка».**
**14.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**15.05** «Сам-насам з усімі».
**16.20** «Таблетка».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Прынц Сібіры».**
**0.25** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** СТБ-спорт.
**8.30 Маст. фільм «Далікатная зіма». 1-я і 2-я серыі.**
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.50, 23.20 «NEXT». Серыял.**
**15.35** «Эліксір маладосці».
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзень «Касмічных гісторый».
**23.00** «Аўтапанарама».
**1.00** «Дакументальны праект»: «Пісьмы з космасу», «Старажытныя геніі».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.10** «Агульны інтарэс».
**9.40, 1.00 Маст. фільм «Сіняе неба».**
**11.05 Маст. фільм «Француз».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20 Серыял «Развод».**
**15.00, 3.35** «Справы сямейныя».
**16.20, 2.40** Дак. серыял «Іншы свет».
**16.50, 3.10** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**17.20 Серыял «Насланнё».**
**21.05 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**
**22.10 Маст. фільм «Спартакіяда. Лакальнае пацапленне».**
**23.55** Галоўная тэма.
**0.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**4.35 Маст. фільм «Маё каханне».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.25** «Праабражэнцы». «Прататыпы. Прафесар Праабражэнскі. Жахлівая гісторыя».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Каменская».**
**19.10, 20.55 Серыял «Земскі доктар».**
**22.00, 23.10 Серыял «Вясковы раман».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05 Серыял «Таксістка».**
**7.10** «Цуд тэхнікі».
**8.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Святло і цень маяка».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.10 Серыял «Браценікі».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Павуцінне».**
**21.25 Серыял «Інспектар Купер».**

### 8 канал

**7.00, 14.05, 19.45, 21.05, 23.45** Надвор'е.
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.50 Серыял «Бібліятэкары».**
**8.30, 18.30 Серыял «Каханне імператрыцы».**
**9.35, 12.55, 13.50, 15.45, 16.45, 18.25, 19.35, 21.00** «Хатняя крама».
**9.45** «Мой любімы гадаванец».
**10.15** «Хобі + TV». Рэаліці-шоу «Свой фермер».
**11.15 Камедыя «Прывітанне сям'і».**
**13.00 Серыял «Героі».**
**14.10 Серыял «Каханне і страх».**
**16.30** «Кінаблакнот».
**17.00 Серыял «Дні анёла».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Камедыя «Пастка».**
**23.15 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў».**

### ВТБ

**6.00, 8.30, 11.30, 22.30, 4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30, 9.00, 17.30, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 14.00** «Ералаш».
**9.00, 18.00, 23.00** Серыял «Тата на вырост».
**10.00, 19.00** Серыял «Кахае не кахае».
**12.00** Камедыя «Укол парасонікам».
**15.00** Скетчком «Студэнты».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.00, 23.30, 4.30** «Лаві момант».
**20.30** Камедыя «Красуні».
**0.30** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Зачараваныя».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Наглядальнік».
**11.15** «Прыміце выклік, сіньёры!» Маст. фільм. 2-я серыя.
**12.25** «Галаўны боль спадара Люм'ера». Дак. фільм.
**13.05** «Правілы жыцця».
**13.40** «Эрмітаж».
**14.10, 0.00** «Цудоўныя спадары з Буа-Дарэ». Серыял.
**15.10** «85 гадоў з дня нараджэння Георгія Сямёнава. «Знак вечнасці «. Дак. фільм.
**15.50** Сусветныя скарбы.
**16.10** «Саці. Нясумная класіка...»
**16.55** «Кінескоп». «Іспанскае кіно сёння».
**17.35** І. Брамс. Сімфонія № 4. МГАСА пад кіраўніцтвам Паўла Когана.
**18.15** «Па слядах касмічных зданяў». Дак. фільм.
**18.45** «Ігар Маісееў. Я успамінаю... Гастролі даўжынёю ў жыццё».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Успамінаючы Алену Абразцову. «Оперны баль» у Вялікім тэатры. Запіс 2014 года.
**23.10** «Партрэт у інтэр'еры тэатра. Аляксей Мірашнічэнка. Пермскі акадэмічны тэатр оперы і балета». Дак. фільм.
**23.55** Мастсавет.
**1.30** «Дом мастацтваў». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Дзве гадзіны з бардамі». 1987 год.
**7.55, 2.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Міхаіл Жванецкі.
**8.20, 9.50, 11.20, 12.50, 14.25, 15.40, 17.00, 18.45, 20.25, 21.40, 23.00, 0.35, 2.40, 5.20** Музычная настальгія.
**8.30** «Зямля-Паветра». Дэцл. 2003 год.
**10.00** Маст. фільм «Жанчыны жартуюць сур'ёзна».
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Падольскі рокфестываль». Марк Рудзінштэйн, Піт Калупаеў. 2005 год.
**13.10** Маст. фільм «Кожны дзень жыцця».
**14.45, 20.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!»
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітскоўскім: «Узбекская справа». Т. Гдлян. 2005 год.
**19.00** Маст. фільм «Как молоды мы былі».
**0.00** «Рок-н-рол ТБ». Музычная праграма. 1992 год.
**3.00** «Быў час». 2009 год.
**4.00** Маст. фільм «Пятля Арыёна».

### EuroSport 1

**2.15, 9.00, 13.30, 19.00, 21.30, 22.05** Біятлон. Кубак свету.
**2.45, 5.00. 8.00, 12.30, 20.45, 1.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**3.30, 7.00, 11.00, 15.00, 23.45** Снукер. Мастэрс.
**6.00** Зімовыя віды спорту.
**10.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны.
**10.30, 22.00, 1.15** Ралі-рэйд. Дакар.
**19.30, 22.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**1.00** Аўта- і матаспорт. Акадэмія GT.

### Камедыя

**0.50** Камедыя «12 Калядных жаданняў».
**2.25** Камедыя «Каманда мары».
**4.05** Камедыя «Палярны рэйс».
**5.35** Камедыя «Пяць нявест».
**7.20** Камедыя «Любовь-морковь 3».
**9.00** Прыгоды «Выхадныя».
**10.40** Камедыя «Елкі. 1914».
**12.30** Камедыя «Госць».
**14.00, 14.50, 15.40, 17.40** Скетчком «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Шалёныя грошы».
**18.00** Камедыя «Зануда».
**19.40** Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
**21.30** Камедыя «К-9: Калядныя прыгоды».
**23.05** Камедыя «Любовь-морковь 2».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.45** «Доктар І...»
**8.15, 19.00, 1.20** «Дзе мая дачка». Серыял.
**9.55, 3.35** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.45, 4.20** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.40** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.35** «Жыццё як жыццё». Дак. серыял.
**13.30, 17.50** «Брыгада». Серыял.
**14.30** «Простыя складанасці».
**15.05, 2.50** «Нераскрытыя тайны».
**16.00** «Мой герой».
**16.50, 21.55** «Пры загадкавых абставінах». Серыял.
**20.55, 0.35** «Неспакойны ўчастак». Серыял.
**22.55, 5.10** «Зорныя гісторыі».
**23.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.00** Камедыя «Дагары нагамі».
**7.30, 0.15** Прыгоды «Маска Зорра».
**9.50** Камедыя «Амаль знакаміты».
**11.50** Драма «Лінкальн для адвакаты».
**13.50** Меладрама «Развод памерыканску».
**15.40** Меладрама «Жонка падарожніка ў часе».
**17.30** Фантастыка «Галодныя гульні: І ўспыхне полымя».
**20.00** Трылер «Палонныя».
**22.30** Меладрама «Замуж на 2 дні».
**2.30** Драма «Лофт».
**4.10** Драма «Дзіяна: Гісторыя кахання».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Меладрама «Унук Гагарына».
**7.45** Драма «Ганна і камандор».
**9.10** Камедыя «Аддамся ў добрыя рукі».
**11.00** Камедыя «Калачы».
**12.30** Меладрама «Ваенна-палявы раман».
**14.05** Меладрама «Дзённік мамы першакласніка».
**15.35** Прыгоды «Яраслаў».
**17.25** Камедыя «Нерэальнае каханне».
**18.55** Камедыя «Заказ на аднаго».
**20.20** Меладрама «Чалавек каля акна».
**22.10** Меладрама «Кахае не кахае».
**0.05** Драма «Шык».
**1.50** Камедыя «Карпаратыў».
**3.15** Казка «Чарадзейны партрэт».
**4.45** Трагікамедыя «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца».

### National Geographic

**6.00, 17.10** Супербудаванні Трэццяга рэйха.
**6.50, 13.45, 18.00, 21.00, 0.45, 3.45** Гульні розуму.
**7.30** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00** Горшае надвор'е ў гісторыі?
**8.45** Даследчык 2.0.
**9.30, 14.10, 19.30** Ліхтугі за мяжой.
**10.20, 14.50, 20.15, 0.00, 2.15, 5.15** Расследаванні авіякатастроф.
**11.00** Экстрэмальныя даследчыкі.
**11.50** Шаша праз пекла.
**12.35** Золата Юкана.
**15.40** Дынаманія.
**16.25** Цуда-юда дыназаўры.
**18.40, 21.45, 1.30, 4.30** Як перамагчы ва ўсім.
**22.30** Тайны гісторыі.
**23.15** Эвакуацыя Зямлі.
**3.00** Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.

### Discovery

**6.00, 10.30, 20.00** Хуткія і гучныя.
**6.50** Звышчалавечая навука.
**7.45, 12.20, 19.30** Як гэта ўстроена?
**8.10, 12.45, 19.00** Як гэта зроблена?
**8.40** Бітвы за кантэйнеры.
**9.35, 5.15** Беар Грылс: кадры выратавання.
**11.25, 4.25** Хаос у дзеянні.
**13.15, 23.00, 3.40** Легендарны аўтамабіль.
**14.10** Залатая ліхаманка.
**21.00** Страсць да матораў.
**22.00** Вулічныя гонкі.
**0.00, 2.50** Бітва за нерухомасць.
**1.00** Махінатары.
**2.00** Маланкавыя катастрофы.
**2.25** Сапраўдныя аферысты.

## Футбол як стыхія. Футбол як жыццё

**Дырэкцыя інтэрнэт-навін АТН, створаная ў структуры Белтэлерадыёкампаніі параўнальна нядаўна, паспяхова рэалізуе некалькі праектаў. Адзін з іх — праграма «Козел пра футбол», якая ўжо трэці сезон распавядае гледачам пра футбольныя страсці. У кожным выпуску аўтар і вядучая Хрысціна Козел расказвае пра адзін пэўны матч або падзею з жыцця айчыннага футбола.**



Штогод у рамках праграмы «Козел пра футбол» выпускаецца прамакаляндар. Гэтым разам у ім канцэптуальна ўвасоблена ўяўленне пра аснову жыцця — 4 стыхіі. Зямля, вада, паветра і агонь — гэта тое, што знаходзіцца вакол нас і робіць магчымым існаванне ўсяго жывога на планеце...

Але ж і футбол для мільёнаў людзей — увасабленне самога жыцця. Адданасць традыцыі можа быць моцная, як марскія хвалі; запал і перажыванні за гульню любімай каманды часам палаюць, як наймацнейшы пажар; перамога ж — гэта глыток паветра, а пастаянная падтрымка балельшчыкаў для любога гульца — пажыўная, нібы глеба для раслін.

Вядучая праграмы Хрысціна Козел, як ключавая персона праекта, у розных вобразах на фоне фантасмагарычных пейзажаў увасобіла галоўную ідэю канцэпцыі — «Стыхія. Жыццё. Футбол». Навоўвядзенне ў календары гэтага года — невялікі астралагічны прагноз для кожнага са знакаў задыяка. Прамакаляндар «Стыхія. Жыццё. Футбол» — праект некамерцыйны і не рэалізуецца ў гандлёвых пунктах. Стаць яго ўладальнікам могуць удзельнікі розыгрышаў у афіцыйных суполках праекта «Козел пра футбол» у сацыяльных сетках.

## Школа сапраўднага артыста ад Юзары

**«Арт-платформа» — гэта дзіцяча-маладзёжны цэнтр мастацтваў, дзе сабрана ўсё, што патрэбна для будучых прафесійных артыстаў.**

Тут будзе магчымасць наведваць заняткі па вакале, харэаграфіі, артыстычным майстэрстве, а таксама займацца напісаннем аўтарскіх песень, здымкамі кліпаў. Цэнтр стварылі папулярны артыст і прадзюсар Юзары і вядомы харэограф Вольга Шамрова.



Галоўная мэта гэтага праекта — сабраць цікавых, таленавітых і крэатыўных дзяцей і моладзь, якія любяць музыку, танец і творчасць. І не проста навучыць майстэрству, але і дапамагчы ў рэалізацыі іх ідэй і творчых патрэб. Прыклады паспяховага супрацоўніцтва ў такім напрамку многім ужо вядомыя, бо імёны Надзеі Місяковай, Марыі Новік, Дар'і Марцінкевіч, Аляксандра Міненкі і іншых гучалі ўжо на розных беларускіх і міжнародных музычных конкурсах і праектах «Еўрабачанне», «Голас», «Новая хваля».

Адкрыццё цэнтра запланавана на 11 студзеня, а напярэдадні 9 і 10 студзеня адбудзецца заключны этап праслухоўванняў юных талентаў па адрасе: Мінск, вул. Чабатарова 7А, офіс 19. Усю падрабязную інфармацыю можна знайсці на сайце artplatforma.com.

**Алена ДРАПКО.**

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** Гарманічны і спакойны тыдзень. Падзеі будуць працякаць павольна, што дазволіць не ператаляць сябе ні ў справах, ні ў думках. Тым не менш варта надаць увагу менавіта зносінам, камунікацыям, каб не ўпусціць удалы момант або інфармацыю, якая можа быць карыснай. У цэлым тыдзень дастаткова паспяховы, асабліва пачынаючы з сярэдзіны і бліжэй да канца, калі вы будзеце напоўнены сіламі, што дазволіць лёгка пасоўвацца наперад у вашых задумах. У асабістым жыцці таксама назіраецца гарманічны перыяд.

**СКАРПІЁН.** Вельмі актыўны і дынамічны тыдзень. Атрымаецца значна прасунуцца наперад і дасягнуць запланаваных раней мэт. Галоўным вашым памочнікам будзе ваш розум, Адзіная цяжкасць, якая можа чакаць, гэта немагчымасць выбраць нешта адно, каб давесці гэта да розуму. Вам неабходна сканцэнтраваць свае намаганні і дзейнічаць у адпаведнасці з планам, у такім выпадку выніковасць усіх дзеянняў будзе значна вышэйшай. Для адносін тыдзень выглядае нейтральна, а вось у матэрыяльным плане можна разлічваць на паляпшэнне.

**СТРАЛЕЦ.** Пачатак тыдня будзе трыумфальным. Вам нарэшце ўдасца адчуць сябе не толькі на сваім месцы, але і даказаць усім астатнім, што вы маеце пэўную вагу і значнасць. У гэты час вашы парады будуць асабліва каштоўныя, і людзі стануць прыслухоўвацца да іх. Заадно можаце параіць нешта карыснае і самому сабе, бо тыдзень спрыяльны для духоўных пошукаў. Час добры для цёплых успамінаў і зносін у коле сям'і або блізкіх сяброў, што дазволіць вам папоўніць сілы і адпачыць.

**КАЗЯРОГ.** У пачатку тыдня настрой можа быць упадніцкі. Верагодна, некаторыя падзеі выведуць вас з душэўнай раўнавагі, і далёка не заўсёды гэта прывядзе да прыемных эмоцый. Але ў хуткім часе негатыўныя аспекты пройдуць, а напрамак для руху застанецца, што адыграе вельмі станоўчую ролю і дазволіць вам не засяджвацца на месцы. У другой палове тыдня вы страсяце з сябе ўсякую стомленасць і пачнеце актыўна рухацца наперад; з'явяцца новыя ідэі, імкненні і жаданні, жыццё ўжо не будзе сумным.

**ВАДАЛЕЙ.** Вы вельмі сур'ёзна ставіцеся да пытанняў матэрыяльнага дабрабыту, што не дазваляе аб'ектыўна і ўсебакова глядзець на навакольны свет. З-за гэтага можа пацярпець эмацыйны бок жыцця. Давядзецца выбіраць, на што звярнуць увагу — на матэрыяльнае або духоўнае. Ці ж знайсці спосаб ураўнаважыць свае магчымасці і патрэбы і паспець усюды. Тыдзень спрыяльны і для першага, і для другога, трэба толькі прыняць правільнае рашэнне.

**РЫБЫ.** Тыдзень вельмі напружаны. Вам трэба будзе адстойваць свае пазіцыі па ўсіх напрамках і на паразуменне з навакольнымі разлічваць не даводзіцца. Сітуацыя можа запатрабаваць шмат сіл і пад канец тыдня выматаць вас. Будзеце замкнёныя ў сабе і не знойдзеце часу і жадання для таго, каб пагутарыць з блізкімі, роднымі, даўнімі сябрамі. У вас не будзе жадання і сіл нават на тое, каб проста радавацца жыццю. Тым не менш вам удасца вырашыць усе пытанні і наладзіць свае справы.

## Чацвер, 14 студзеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.20** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**10.50 Серыял «Крыху не ў сабе».**
**12.10, 16.40 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.10** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «А шчасце дзесьці побач».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.25 Серыял «Не жаночая справа».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20, 23.35** Сфера інтарэсаў.
**20.00, 1.20 Серыял «Снайперы. Каханне пад прыцэлам».**
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**0.10** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 17.30** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**9.35, 22.10** «Арол і Рэшка». Трэвел-шоу.
**10.35, 16.30 Трылер «Закрытая школа».**
**11.35, 21.10** «Чалавек-нябачнік». Рэаліці-шоу.
**12.30, 18.05 Серыял «Вароніны».**
**13.35, 20.05 Серыял «Шурачка».**
**14.30, 19.05 Серыял «Кухня».**
**15.30, 23.55** «Разбуральнікі міфаў».

### Беларусь 3

**22.05** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.05 Серыял «Косці».**
**0.50 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

**7.20, 10.25, 17.55, 23.40** «Калейдаскоп».
**7.35** «Сусветная карцінная галерэя».
**8.05, 19.50 «Кліч продкаў». Серыял.**
**8.55 «Лэдзі і разбойнік». Меладрама.**
**10.40, 18.10** «Размаўляем па-беларуску».
**10.50 «Развітанне з Пецярбургам». Меладрама.**
**12.20** А. Вазнясенскі. «Юнона» і «Авось». Спектакль Дзяржаўнага музычнага тэатра Беларусі.
**13.50, 23.15** «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара Уладзіміра Алоўнікава.
**14.15 «Пігмаліён». Камедыя.**
**15.55** «Сіла веры».
**16.20 «Зусім прапалы». Камедыя.**
**18.20** «Маладыя таленты Беларусі. Эстрада».
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Легенды беларускай эстрады».
**21.30 «Георг». Драма.**

### Беларусь 5

**6.20, 18.50, 22.05** PRO спорт. Навіны.
**6.30** Баскетбол. НБА. «Кліперс» — «Маямі».
**8.50, 12.10** Тэніс. Турнір WTA. Сідней. 1/2 фіналу.
**10.50** Баскетбол. Кубак ФІБА. АЕК (Кіпр) — «Цмокі-Мінск».
**14.05** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Індывідуальная гонка. Мужчыны.
**16.10, 22.15** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Індывідуальная гонка. Жанчыны.
**18.15** Спорт, спорт, спорт. Зіновій Салаўёў.

**18.55** Хакей. Белнафтахім — чэмпіянат Беларусі. Другі этап. «Шахцёр» (Салігорск) — «ХК Гомель».
**21.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.15, 13.10, 22.45 Серыял «Усмешка перасмешніка».**
**14.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**15.05** «Сам-насам з усімі».
**16.20** «Таблетка».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Прынц Сібіры».**
**0.25** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** СТБ-спорт.
**8.30 Маст. фільм «Чалавек з дажджом у чаравіках».**
**10.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.50, 23.40 «NEXT 2». Серыял.**
**15.30** «Самая карысная праграма».
**16.50** «Ведай нашых!»
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».

**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Жаданне».**
**22.10** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20** «Аўтапанарама».
**1.10** «Тайны Чапман».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Чаму я?»
**9.30, 1.00 Маст. фільм «Куды ён дзенецца».**
**11.10 Маст. фільм «Ой, мароз, мароз!».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20 Серыял «Разводзі».**
**15.00, 3.45** «Справы сямейныя».
**16.20, 2.50** Дак. серыял «Іншы свет».
**16.50, 3.20** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**17.20 Серыял «Насланнё».**
**21.05 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**
**22.10 Маст. фільм «Рэцэпт вядзьмаркі».**
**23.55** Галоўная тэма.
**0.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**4.45 Маст. фільм «Падкідыш».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Уся Расія».
**12.05** «Сведкі». «Анатоль Чарняеў. Выйсці з ценю».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Каменская».**
**19.10, 20.55 Серыял «Земскі доктар».**

**22.00, 23.10 Серыял «Вязкові раман».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05 Серыял «Таксістка».**
**7.10** «Цуд тэхнікі».
**8.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Святло і цень маяка».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.10 Серыял «Браценікі».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Павуцінне».**
**21.25 Серыял «Інспектар Купер».**

### 8 канал

**7.00, 14.05, 19.45, 21.05, 23.45** Надвор'е.
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.50 Серыял «Бібліятэкары».**
**8.30, 18.30 Серыял «Каханне імператрыцы».**
**9.30** «Кінаблакнот».
**9.45** Дак. фільм «Хто забіў Распуціна».
**10.30** Прыгоды «Рэйнджар».
**12.55, 13.50, 15.45, 16.45, 18.25, 21.00** «Хатняя крама».
**13.05 Серыял «Героі».**
**14.10 Серыял «Каханне і страх».**
**16.20** «Мой любімы гадаванец».
**17.00 Меладрама «Урокі французскай».**
**19.35** «Фэшн is my прафэшн».
**20.45** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Драма «Ліга мары».**
**23.15 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў».**

### ВТБ

**6.00, 8.30, 11.30, 22.30, 4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30, 9.00, 17.30, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 14.00** «Ералаш».
**9.00, 18.00, 23.00** Серыял «Тата на вырост».
**10.00, 19.00** Серыял «Каханне не каханне».
**12.00** Меладрама «Даруй за каханне».
**15.00** Скетчком «Студэнты».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.00, 23.30, 4.30** «Лаві момант».
**20.30** Камедыя «Пастка для нявесты».
**0.30** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Зачараваныя».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Наглядальнік».
**11.15** «Дульсінея Табоская». Маст. фільм. 2-я серыя.
**12.20** «Барыс Плотнікаў». Дак. фільм.
**13.05, 20.45** «Правілы жыцця».
**13.30** «Бенядыкт Спіноза». Дак. фільм.
**13.40** «Расія, любоў мая!» «Церскія казакі».
**14.10, 0.00** «Цудоўныя спадары з Буа-Дарэ». Серыял.
**15.10, 22.20** «Аголеная тэракотавая армія». Дак. фільм.
**16.00** «Роберт Фолкан Скот». Дак. фільм.
**16.10** «Абсалютны слых».
**16.55** «Тэорыя адносчасці шчасця. Па Андрэю Будкеру». Дак. фільм.
**17.35, 0.50** Юрый Башмет, Барыс Беразоўскі і ДСА «Новая Расія». Канцэрт у Канцэртнай зале імя П.І. Чайкоўскага.

**18.45** «Ігар Маісееў. Я ўспамінаю... Гастролі даўжынёю ў жыццё».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**21.15** Сусветныя скарбы.
**21.30** «Культурная рэвалюцыя».
**23.10** «Партрэт у інтэр'еры тэатра. Сяргей Баброў. Краснаярскі тэатр оперы і балета». Дак. фільм.
**23.55** Мастсавет.

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Узбекская справа». Т. Гдлян. 2005 год.
**6.50, 8.25, 9.40, 11.00, 12.50, 14.25, 15.40, 17.00, 18.55, 20.20, 21.40, 23.00, 0.50, 2.25, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.00** Маст. фільм «Как молоды мы былі».
**8.45, 14.45, 20.45, 2.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**13.05** Маст. фільм «І чорт з намі...»
**18.00** «Народжаныя ў СССР» Найлепшае. 2014 год.
**19.20** Маст. фільм «Зазуля з дыпломам».
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Падольскі рокфестываль». Марк Рудзінштэйн, Піт Калупаеў. 2005 год.
**0.50** Музычная настальгія.
**1.10** Маст. фільм «Кожны дзень жыцця».

### EuroSport 1

**2.30, 6.00, 9.30, 13.30, 18.00, 1.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**3.30, 7.00, 11.00, 21.00, 22.05** Снукер. Мастэрс.

**5.00, 8.30, 12.30, 19.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**10.30, 22.00, 1.00** Ралі-рэйд. Дакар.
**16.00, 20.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.

### Камедыя

**0.50** Камедыя «К-9: Калядныя прыгоды».
**2.25** Камедыя «Любовь-морковь 2».
**4.10** Камедыя «Чалавек-эльф».
**5.40, 21.30** Прыгоды «Выхадныя».
**7.15** Камедыя «Шалёныя грошы».
**9.00** Камедыя «Зануда».
**10.40** Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
**12.30** Камедыя «Тарыф Навагодні».
**14.00, 14.50, 15.40, 17.40** Скетчком «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Ёлкі 3».
**18.00** Камедыя «К-9: Калядныя прыгоды».
**19.40** Камедыя «Елкі. 1914».
**23.05** Камедыя «Дыска».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.00** «Доктар І...».
**8.30, 19.00, 1.30** «Дзе мая дачка». Серыял.
**10.00, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.50, 4.25** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.45** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.40** «Жыццё як жыццё». Дак. серыял.
**13.35, 17.50** «Брыгада». Серыял.
**14.35** «Простыя складанасці».
**15.05, 2.55** «Нераскрытыя тайны».
**16.00** «Мой герой».
**16.50, 21.50** «Пры загадкавых абставінах». Серыял.

**20.50, 0.45** «Жанчына ў бядзе». Серыял.
**22.55, 5.15** «Зорныя гісторыі».
**23.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**0.35** «Рокіно».

### ТБ1000

**6.20** Драма «Сем гадоў у Тыбеце».
**8.40** Драма «Усмешка Моны Лізы».
**10.40** Меладрама «Замуж на 2 дні».
**12.30** Камедыя «Мая жудасная нянька».
**14.10** Меладрама «Да цуду».
**16.00** Фантастыка «Пасведчаны».
**17.40** Драма «V» значыць Вендэта».
**20.00** Драма «Пробліск геніяльнасці».
**22.00** Фантастыка «Вострaў».
**0.20** Трылер «У нетрах кашмару».
**2.00** Баявік «Тэрмінатар: Няхай прыйдзе выратавальнік».
**4.00** Трагікамедыя «Пакуль не накрыўся вечкам».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Меладрама «Ваенна-палявы раман».
**8.10** Камедыя «Пісталет Страдывары».
**10.10** Камедыя «Аддамся ў добрыя рукі».
**12.10** Меладрама «Унук Гагарына».
**13.40** Казка «Пасля дождычку ў чацвер».
**15.10** Драма «Каляфутбола».
**17.05** Меладрама «Падарожжа з хатнімі жывёламі».
**18.50** Меладрама «Дзённік мамы першакласніка».
**20.20** Драма «24 гадзіны».
**22.00** Баявік «На гульні».
**23.40** Баявік «На гульні 2. Новы ўзровень».
**1.15** Трагікамедыя «Майстэрства жыць у Адэсе».

**3.00** Камедыя «Пісталет Страдывары».
**4.20** Прыгоды «Сляды апосталаў».

### National Geographic

**6.00, 17.10** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 8.00, 13.45** Гульні розуму.
**7.35, 13.20** Навуковыя недарэчнасці.
**8.45** Як перамагчы ва ўсім.
**9.30, 14.10, 19.30** Ледзяная дарога.
**10.20, 14.50, 20.15** Непакорлівы востраў.
**11.00** Экстрэмальныя даследчыкі.
**11.50** Шаша праз пекла.
**12.35** Золата Юкана.
**15.40** Смяротны бой дыназаўраў.
**16.25** Праект «Дыназаўр».
**18.00, 21.00, 0.45, 3.45** Незвычайныя промыслы.
**18.40, 21.45, 1.30, 4.30** Тэхаскі ўлоў.
**22.30** Фатальная стыхія.
**23.15** Эвакуацыя Зямлі.
**0.00, 2.15, 5.15** Рассledаванні авіякатастроф.
**3.00** Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.

### Discovery

**6.00, 10.30** Кубінскі хром.
**6.50** Гігацкія машыны.
**7.45, 12.20** Як гэта ўстроена?
**8.10, 12.45** Як гэта зроблена?
**8.40** Склады.
**9.35, 5.15** Голыя і напалохання.
**11.25, 4.25** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**13.15** Залатая ліхаманка.
**22.00** Зніклае золата.
**23.00** У пошуках скарбаў.
**0.00, 2.50** Гаражнае золата.
**1.00** Махінатары.
**2.00** Маланкавыя катастрофы.
**2.25** Сапраўдныя аферысты.
**3.40** Майстэрня «Фантом Уоркс».

## Субота, 16 студзеня

### Беларусь 1

**7.05** Існасць.
**7.30 Меладрама «Я яго зляпіла».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.30** Трансфармацыя.
**10.00** «50 рэцэптаў першага».
**10.50 Меладрама «Мама выходзіць замуж».**
**12.55** «Здароўе». Ток-шоу.
**13.30, 16.00 Меладрама «Погляд з вечнасці». 1—4-я серыі.**
**15.15** Краіна.
**21.00** Панарама.
**21.40 Камедыя «Гараскоп на ўдачу».**
**23.20 Драма «Танцуй...».**
**1.00** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.50** Я хачу гэта ўбачыць!
**7.20** Беларуская кухня.
**7.50, 21.05** Тэлебарометр.
**7.55** Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна.
**8.20 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**10.15** Азбука смаку.
**10.50 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
**12.45** Капейка ў капейку.
**13.20** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**13.55** «Бітва экстрасэнсаў. Вайна тытанаў».
**16.00** «Разбуральнікі міфаў».
**17.00** «Арол і Рэшка. Шопінг». Стайл-шоу.
**17.55 Выбар гледачоў. Фантастыка «Расамаха: Бессмяротны».**
**20.00** «Здзіві мяне». Талент-шоу.
**21.10 Баявік «Перавозчык 3».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.10** «Арол і Рэшка. Нязведаная Еўропа». Трэвел-шоу.
**0.05 Камедыя «Мужчына ў маёй галаве».**

### Беларусь 3

**7.50, 12.30, 17.15, 23.40** «Калейдаскоп».
**8.05, 15.40 «Прадаецца дача». Камедыя.**
**9.40** «Сустрэча на Эльбе». Дак. фільм.
**10.10 «Быў месяц май». Драма.**
**12.00** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.45 «Маё каханне на трэцім курсе». Драма.**
**14.10** «Сяргей Любавін запрашае».
**15.10** «Камертон». Заслужаная артыстка Расіі Алена Вárабей.
**17.30 «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Серыял. «Сабака Баскервіляў».**
**20.00** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя тайны». «Маякоўскі. Апошняе каханне, апошні стрэл». Дак. фільм.
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Легенды беларускай эстрады».
**21.30 «Паляўнічыя на воблакі». Прыгоды.**
**23.00** «Бард парад».

### Беларусь 5

**6.55, 23.55** PRO спорт. Навіны.
**7.05** Баскетбол. НБА. «Мілуокі» — «Атланта».
**8.45** Хакей. КХЛ. «Салават Юлаеў» (Уфа) — «Дынама-Мінск».
**10.35** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Харватыя — Беларусь.
**12.05** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Эстафета. Мужчыны.
**13.35** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Масстарт. Жанчыны.
**14.35** На шляху да Еўра-2016. Відэачасопіс.
**15.10** Фактар сілы.
**15.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Тотэнхэм» — «Сандэрленд».
**17.40** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**18.05** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Масстарт. Мужчыны.
**18.55** Хакей. Белнафтахім — чэмпіянат Беларусі. Другі этап. «Юнацтва Мінск» — «Нёман» (Гродна).
**21.10** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Масстарт. Жанчыны.
**22.10** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Данія — Расія.
**0.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Астан Віла» — «Лестэр».

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** Да юбілею Райманда Паўлса. «Мільён пунсовых руж».
**10.25** «Смак».
**11.00** «Ідэальны рамонт».
**12.00** «Разумніцы і разумнікі».
**12.45 Камедыя «Старыя-разбойнікі».**
**14.20** «Тэорыя змовы».
**15.15** «Следства пакажа».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Адгадай мелодыю».
**16.55 Камедыя «Вяселле ў Малінаўцы».**
**18.30** Юбілейны вечар Алега Табакова ў МХТ імя А.П. Чэхава.
**21.05** «Сёння ўвечары».
**22.35** «Захавай мае словы назаўсёды». Памяці паэта Восіпа Мандэльштама.
**0.10 Маст. фільм «Капітал».**

### СТБ

**6.35 Мюзікл «Чыкага».**
**8.30** «Анфас».
**8.45 Фільм-казка «Не пакідай...».**
**11.10** «Мінск і мінчане».
**11.45 «Салдаты 7». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 1.15 Маст. фільм «Вялікі сын».**
**15.55** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.55 Камедыя «Няўдачлівыя».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Халодная гара».**
**22.55** «Вялікія тайны Ватыкана».

### МІР

**6.00 Маст. фільм «Мільён у шлюбным кошыку».**
**7.30** «Саюзнікі».
**8.00, 13.05** М/ф.
**8.30** «Медыцынская праўда».
**9.00** «Ой, мамачкі».
**9.30** «Няма праблем».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».
**10.45 Маст. фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў».**
**12.35** Кулінарнае шоу «Цяжар абеду».
**13.30 Маст. фільм «Картачны домік».**
**16.15, 3.30** Дак. фільм «Практычная магія».
**17.05 Серыял «Маша ў законе».**
**22.35 Маст. фільм «Белая ноч, пяшчотная ноч».**
**0.35** «Культпрасвет».
**1.20** «Дыяспары».
**1.50 Маст. фільм «Рэцэпт вядзьмаркі».**
**4.20 Маст. фільм «Член урада».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.35 Маст. фільм «Адзінокія сэрцы».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Правілы руху».
**12.10 Маст. фільм «Там, дзе ёсць шчасце для мяне».**
**14.15** «Дзве жонкі».
**15.05** «Асабістае. Уладзімір Зельдзін».
**15.55, 20.55 Серыял «Каханне — не бульба».**
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**23.15 Маст. фільм «Выратаванае каханне».**

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 8.20 Серыял «Таксістка».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.00** «ГМА. Ежа разладу».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Сцежкаю тыгра». Дак. фільм.
**14.25** «Паедзем, паядзім!»
**15.05, 16.20 Серыял «Двое з пісталетамі».**
**18.05** «Следства вялі...»
**19.20 Серыял «Метэарыт».**
**22.45 Маст. фільм «Фокуснік».**
**0.25** «Справа цёмная».

### 8 канал

**9.00, 15.50, 19.05, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.20 Серыял «Каханне імператрыцы».**
**10.20, 10.45, 15.55, 17.25** «Хатняя крама».
**10.35** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.00 Прыгоды «Мумія».**
**13.10 Прыгоды «Мумія вяртаецца».**
**15.20** Мультпарад.
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Альф».**
**17.35 Камедыя «Супернянь».**
**19.10 Камедыя «Законы прывабнасці».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Дэтэктыў «Знікненне».**

### ВТБ

**6.00, 14.00, 23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30, 9.00, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Пінгвіняня Пораро».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00, 16.30** «Ералаш».
**9.30, 23.30, 5.30** «Лаві момант».
**10.00, 3.00** «Турбаміксер».
**12.00** Камедыя «Фартуна Вегаса».
**14.30** «Вялікая маленькая зорка».
**15.30** Кулінарнае шоу «Майстаршэф. Дзеці».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**18.30** Серыял «Як я стаў рускім».
**20.30** Камедыя «Вакол свету за 80 дзён».
**0.30** «Дурні і дарогі».
**1.00** Скетчком «Студэнты».
**2.00** Скетч-шоу «Мільёны ў сетцы».

### Культура

**6.30** «Еўранеюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35** «Маё каханне». Маст. фільм.
**11.50** «Лідзія Смірнова. Выпрабаванне пачуццяў». Дак. фільм.
**12.30** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**13.00** Гала-канцэрт лаўрэатаў Усерасійскага фальклорнага конкурсу «Казачы круг».
**14.25** Да 100-годдзя Тацяны Карпавай. Ж. Сіменон. «Мегрэ і чалавек на лаўцы». Тэлеспектакль. Запіс 1973 года.
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** «Зусім сур'ёзна». Маст. фільм.
**18.25** Сусветныя скарбы.
**18.45** Да 80-годдзя кампазітара. «Раймонд Паўлс. Сыграй, маэстра, жыццё сваё...». Дак. фільм.
**19.30** «Рамантыка раманса». Раймонд Паўлс і яго мелодыі.
**20.30** Вялікі балет.
**22.35** «Па-за сістэмай». Вечар-прысвячэнне К.С. Станіслаўскаму ў МХТ. Запіс 2013 года.
**0.25** «Жывая Арктыка. Паўночны Ледавіты акіян. Царства холаду». Дак. фільм.
**1.20** «Бяседа». «Гісторыя аднаго злачынства». «Патоп». М/ф для дарослых.
**1.55** «Шукальнікі». «Дзе знаходзіцца радзіма Залатога руна?».
**2.45** «Навaі». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. 2014 год.
**6.55, 8.25, 9.40, 11.00, 12.40, 14.25, 15.40, 17.00, 18.30, 19.20, 20.45, 23.15, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.20** Маст. фільм «Зазуля з дыпломам».
**8.45, 14.45, 20.45, 2.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Найлепшае. 2009 год.
**13.10** Маст. фільм «Дні лётныя».
**16.00** «Колба часу».
**18.00** «Рок-н-рол ТБ». Музычная праграма. 1992 год.
**18.50** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Раман Карцаў.
**19.50** «Усё будзе так, як мы хочам!» VI Ленінградскі рок-фестываль. 1989 год.
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Маст. фільм «Каранцін».
**0.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**1.05** Маст. фільм «І чорт з намі...»

### EuroSport 1

**2.45, 5.00, 8.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**3.30, 7.00, 11.00, 21.00, 22.05** Снукер. Мастэрс.
**6.00, 9.30, 16.00, 19.00, 1.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету FIS па палётах на лыжах.
**10.30, 22.00, 1.00** Ралі-рэйд. Дакар.
**12.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**13.30, 17.45** Біятлон. Кубак свету.
**14.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**20.00** Зімовыя віды спорту.

### Камедыя

**0.50** Прыгоды «Выхадныя».
**2.25, 8.55** Камедыя «Елкі. 1914».
**4.10** Камедыя «Снежная нявеста».
**5.45** Камедыя «Зануда».
**7.15** Камедыя «К-9: Калядныя прыгоды».
**10.45** Камедыя «Як жаніцца і застацца халастым».
**12.25** Камедыя «Елкі кудлатыя».
**14.00** Камедыя «Што, калі Санта...?».
**15.40, 17.30, 21.05** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Госць».
**18.00** Камедыя «Шалёныя грошы».
**19.40** Камедыя «Зануда».
**21.25** Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
**23.15** Камедыя «Тарыф Навагодні».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.45** «Дачныя гісторыі».
**10.35** «Сто пытанняў даросламу».
**11.20** «Ргокіно».
**11.30** «Хронікі маскоўскага побыту».
**12.20** «Доказ віны».
**13.10, 0.40** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**17.10** «Сцюарт Літл». Анімацыйны фільм.
**18.30, 4.15** «Лінія абароны».
**19.05** «Палюбоўнік». Драма.
**21.10** «Цень». Фантастыка.
**23.10** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.40** «Як прыручыць голад». Дак. фільм.

### ТБ1000

**6.30** Драма «Лофт».
**8.10** Камедыя «Уз'яднанне сям'і Мэдэі».
**10.00** М/ф «Воблачна, магчыма ападкі ў выглядзе фрыкадэлек».
**11.30** Камедыя «Сцюарт Літл».
**13.00** Меладрама «Жонка падарожніка ў часе».
**14.50** Драма «Маленькая жанчыны».
**16.50** Прыгоды «Пачатак часоў».
**18.30** Камедыя «Сцюарт Літл».
**20.00** Баявік «Напруж звіліны».
**22.00** Меладрама «Яшчэ адна з роду Балейн».
**0.00** Меладрама «Жорсткія гульні».
**1.40** Меладрама «Замуж на 2 дні».
**3.45** Камедыя «Амаль знакамітыя».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Казка «Пасля дожджычку ў чацвер».
**8.10** Прыгоды «Сляды апосталаў».
**10.10** Драма «Браты Ч».
**12.05** Драма «Алеся».
**13.35** Баявік «На гульні».
**15.15** Меладрама «Падарожжа з хатнімі жывёламі».
**17.05** Баявік «Васьмёрка».
**18.35** Камедыя «Каўказская палонная».
**20.20** Камедыя «Дванаццаць месяцаў».
**22.10** Меладрама «Чалавек каля акна».
**0.00** Драма «24 гадзіны».
**1.30** Камедыя «Карпаратыў».
**3.05** Камедыя «Ад 180 і вышэй».
**4.50** Прыгоды «Тайна цёмнага пакоя».

### National Geographic

**6.00, 13.20** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 12.40** Гульні розуму.
**7.35, 11.50, 17.10, 23.15, 2.15** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00** Золата Юкана.
**8.45** Навука будучыні.
**9.30** Сканеры старажытнага свету.
**10.20** Космас. Прастора і час.
**11.00** Місія на Марс.
**14.10** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**14.50** Дзікая прырода Амерыкі.
**15.40** Тайнае жыццё драпежнікаў.
**16.25** Суперзбудаванні старажытнасці.
**18.40** Чалавек супраць YouTube.
**21.00, 0.00, 3.45** Уварванне на Зямлю.
**21.45, 0.45, 4.30** Эвакуацыя Зямлі.
**22.30, 1.30, 5.15** Тайны старажытнасці.

### Discovery

**6.00, 13.15, 1.00, 4.25** Страсць да матораў.
**6.50** Зніклае золата.
**7.45, 2.00** Заваяванне новых земляў.
**8.40, 2.50** Аляска: апошні рубеж.
**9.35** Ліквідатар.
**10.30, 21.00** Паляўнічыя на зброю.
**11.25** Паляўнічыя на старызну.
**12.20** Хуткія і гучныя.
**14.10, 22.00, 3.40** Вулічныя гонкі.
**15.05** Як гэта ўстроена.
**20.00** Зорнае выжыванне.
**23.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**0.00** Бітва з акіянам.
**5.15** Як уладкаваны Сусвет.

## Zамор'е

## КОЛЬКІ НАС НА ЗЯМЛІ?

**За год насельніцтва Зямлі вырасла да 7,3 млрд чалавек.**



Насельніцтва нашай планеты склала на 1 студзеня 2016 года амаль 7,3 мільярда чалавек, павялічыўшыся за год на 78 мільёнаў, або на 1,08%, паведаміла Бюро перапісу насельніцтва ЗША. Самыя населеныя краіны свету — Кітай (1,367 мільярда чалавек), Індыя (1,252 мільярда) і ЗША (322,7 мільёна), затым ідуць Інданезія, Бразілія, Пакістан, Нігерыя, Бангладэш, Расія і Японія.

## У САПФІРАЎ НОВЫ КАРОЛЬ

**На Шры-Ланцы знайшлі найбуйнейшы ў свеце сапфір коштам $175 млн.**



Самы буйны ў свеце сапфір вагой у 1404,49 карата быў здабыты на Шры-Ланцы. Спецыялісты Каломба ацэньваюць яго мінімум у $100 млн, а верхняя планка даходзіць да $175 млн. Як паведамляе CNN, каштоўны камень знайшлі яшчэ ў мінулым жніўні ў раёне Ратнапура, дзе здаўна здабываюць і апрацоўваюць сапфіры, рубіны, аметысты і аквамарын.

Гаспадар каштоўнага каменя, які атрымаў назву "Зорка Адама", утойвае сваё імя і прозвішча. Ён таксама не ўдакладняе, колькі заплаціў за яго. «Яму наканавана стаць неацэнным музейным экспанатам. Ён настолькі вялікі, што не месяцца ні ў адну аправу», — прыводзяць журналісты словы ўладальніка скарбу. Адзначаецца, што камень адносіцца да разнавіднасці "зорчатых сапфіраў", якія дэманструюць ярка выяўлены эфект астэрызму (эфект з'яўлення зоркі з прамянёў святла, якія перакрыжоўваюцца, на паверхні каменя) пры апрацоўцы, і таму цэняцца вельмі высока.

## ПАШТАЛЬЁНЫ-ШКОДНІКІ

**Паштальён, які працаваў у нью-ёркскім раёне Куінсі, так знерваваўся з-за колькасці святочных паштовак і падарункаў, якія ён павінен быў даставіць, што вырашыў выкінуць частку з іх.**

Дэніэл Дарбі купіў і аднёс тры смецевыя мяшкі з поштай на сметнік. Пакеты з сотнямі прэзентаў і паштовак знайшлі праз два дні. 25-гадовы мужчына прызнаўся, што некаторыя адпраўленні ён адкрыў, каб убачыць змесціва. У канцы мінулага года работнік прад'явілі абвінавачванні за затрымку дастаўкі і псаванне карэспандэнцыі. Адзначаецца, што ў аналагічных правінах быў абвінавачаны і іншы супрацоўнік паштовага ведамства, Джэймс Хэйдан, які працаваў у Брукліне. Ён скраў каля 50 падарункавых картак, якія былі ў канвертах, і набыў па іх тавараў на тысячу долараў. Пра дзеянні Хэйдана стала вядома пасля таго, як адна з жанчын звязалася з паштовым аддзяленнем і паскардзілася, што пасланая ёю картка не дайшла да адрасата. Абодвум мужчынам пагражае па пяць гадоў турмы і па 250 тысяч долараў штрафу.

**Іван КУПАРВАС.** hvir@zviazda.by

## Кінагід

# Зімнія прэм'еры вялікага экрана

**Гэтай зімой толькі паспявай купляць квіткі ў кіно — столькі новых і цікавых фільмаў выходзіць у пракат. У канцы мінулага года на экраны выйшаў доўгачаканы сёмы эпізод «Зорных войнаў», а ў пачатку гэтага гледачоў чакаюць чарговая карціна пра лёс Стыва Джобса, сумесная праца Анджэліны Джолі і Брэда Піта, новы фільм эпатажнага Квенціна Таранціна і Леанарда Дзі Капрыа з барадой у фільме Аляхандра Іньярыту, за ролю ў якім калі Леа не дадуць «Оскара», то тады амерыканскую кінаакадэмію трэба будзе распусціць. Зрэшты, вам у дапамогу прапануецца спіс галоўных зімніх прэм'ер.**

**«Стыў Джобс».** Новая стужка пра заснавальніка карпарацыі Apple пакажа гледачу тры эпізоды з жыцця Джобса перад вялікімі прэзентацыямі ў 1984, 1988 і 1998 гадах.

**«Які выжыў».** Па сюжэце фільма Аляхандра Гансалеса Іньярыту герой



Леанарда Ды Капрыя аказваецца ў адзіноце на прасторах Дзікага Захаду, дзе яго кідаюць паміраць таварышы, але здавацца ён не збіраецца.

**«Блакітны бераг».** Гэта ўжо трэцяя рэжысёрская праца Анджэліны Джолі, у якой яна і яе муж Брэд Піт зняліся ў галоўных ролях. Як пішуць у прэсе, славутая галівудская пара ў фільме выконвае «вар'яцкія сексуальныя гульні».

**«Агідная васьмёрка».** Дзявятае новага вестэрна Квенціна Таранціна разгортваецца пасля грамадзянскай вайны. Паляўнічы на галовы накіроў-



ваецца ў невялікі пустынны гарадок, везучы з сабой палонную.

**«Джой».** Джэніфер Лоўранс, якая палюбілася гледачам у «Галодных гульнях», зноў паўстане ў вобразе моцнай жанчыны. У біяграфічнай драме Дэвіда О. Расэла яна іграе маці-адзіночку траіх дзяцей, якая становіцца адной з самых паспяховых прадпрымальніц краіны.

**«І грымнуў шторм».** Сюжэт фільма Крэйга Гілеспі заснаваны на рэальных падзеях, якія адбыліся ў ЗША ў 1952 годзе, калі супрацоўнікі берагавой аховы ў разгар шторму, выкарыстоўваючы драўляныя маторныя лодкі, спрабавалі выратаваць экіпаж двух нафтавых танкераў.

**«Дэдпул».** Фантастычны баявік Ціма Мілера з'яўляецца прамым пра-



цягам серыі фільмаў «Людзі Ікс» аб чарговым персанажы-супергерoі коміксаў Marvel па імені Дэдпул.

**«Нехай жыве Цэзар!»** Фільм братоў Коэнаў пакажа гледачам свет Галівуда 50-х гадоў: імперыю бляску, раскошы і распусты, дзе жывуць куміры мільёнаў, і што ні дзень, то баляванне для свецкіх хранікёраў.

Расійскі кінематограф прапануе гледачам некалькі новых камедый, якія павінны падняць настрой гледачам: **«Дзень выбараў — 2»** (працяг папулярнага фільма), **«Краіна Оз»** (вар'яцкія прыгоды ў навагоднюю ноч), **«Самы лепшы дзень»** (прыгоды інспектара ДПС з правінцыі) і **«Нарвер»** (гісторыя чалавека, якому даводзіцца вырашаць праблемы працоўных мігрантак).

## Нядзеля, 17 студзеня

### Беларусь 1

**7.25** Меладрама **«Бацька паняволі».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40** Гісторыі рамонту.
**10.15** «50 рэцэптаў першага».
**11.10** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**11.45** Нашы.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Каробка перадач.
**13.10** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**13.40** Тайны следства.
**14.10** Вакол планеты.
**15.15** Твой горад.
**15.30** Eurovision. Вынікі тыдня.
**15.50** Камедыя **«Гараскоп на ўдачу».**
**17.35** Меладрама **«Андрэйка».**
**21.00** Галоўны эфір.
**21.55** Клуб рэдактараў.
**22.35** Навіны надвор'я.
**22.55** Меладрама **«Я яго зляпіла».**

### Беларусь 2

**6.45** М/с «Сябры анёлаў».
**7.45, 20.05** Тэлебарометр.
**7.50** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**8.20** Серыял **«Хто ў доме гаспадар?».**
**10.10** «Арол і Рэшка. Нязведаная Еўропа». Трэвел-шоу.
**11.20** Ваша лато.
**11.50** Пяцёрачка.
**12.00, 14.25** Серыял **«Мая цудоўная нянька».**
**12.55** Біятлон. Этап Кубка свету. Эстафета. Жанчыны.
**15.25** Фантастыка **«Расамаха: Бессмяротны».**
**17.35** Анімацыйны фільм «Оз: Вяртанне ў Ізумрудны горад».
**19.15** Суперлато.
**20.40** Кіпень.
**21.10** «Панаехалі». Рэаліці-шоу.
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.25** Хачу ў тэлевізар!
**22.30** Серыял **«Косці».**

### Беларусь 3

**8.00, 14.45, 17.55, 0.05** «Калейдаскоп».
**8.15, 15.00, 18.10** «Размаўляем па-беларуску».
**8.20, 22.00** **«Нестар Бурма». Серыял.**
**9.50** **«Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Серыял. «Сабака Баскервіляў».**
**12.15** «Подых струн». Музычная праграма. Госці: Улад Дашчыловіч, Кацярына Аліхвер, Аляксей Краўцоў.
**13.00** «Наперад у мінулае».
**13.25** Хіт парад «Сто песень для Беларусі».
**14.20** «Музеі Беларусі». Музей гісторыі слуцкіх паясоў.
**15.05** **«Пудзіла». Драма.**
**17.00** «Гітара па крузе». Кампазітар, мастачка, аўтар-выканаўца Таццяна Алёшына і музыкант Алена Белкіна.
**18.20** «Камертон». Кінарэжысёр, сцэнарыст і прадзюсар Ягор Канчалоўскі.
**18.45** **«Вяртанне ў «А». Драма.**
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Нашы любімыя». Песні ансамбля «Песняры» розных гадоў.
**23.25** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя тайны». «Маякоўскі. Апошняе каханне, апошні стрэл». Дак. фільм.

### Беларусь 5

**7.25, 23.20** PRO спорт. Навіны.
**7.35** Хакей. Белнафтахім — чэмпіянат Беларусі. Другі этап. «Юнацтва Мінск» — «Нёман» (Гродна).
**9.30** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Масстарт. Мужчыны.
**10.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Астан Віла» — «Лестэр».
**12.10** Баскетбол. НБА. «Мемфіс» — «Нью-Ёрк».
**13.55** Хакей. КХЛ. «Авангард» (Омская вобл.) — «Дынама-Мінск».
**16.15** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Эстафета. Жанчыны.
**17.50** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Беларусь — Ісландыя.
**19.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Сток Сіці» — «Арсенал».
**21.15** Авертайм.
**21.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Манчэстэр Юнайтэд».
**23.30** Баскетбол. НБА. «Мінесота» — «Фінікс».

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** «Пакуль усе дома».
**10.40** «Фазэнда».
**11.15** «Барахолка».
**12.05** «Госці па нядзелях».
**13.00** «Іронія лёсу». Нараджэнне легенды.
**13.55** **Камедыя «Іронія лёсу. Працяг».**
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Яўген Еўтушэнка. «Паэт у Расіі — больш, чым паэт».
**18.40, 21.05** «Новы год».
**20.00** Контуры.
**23.10** **Маст. фільм «Жорсткія рамкі».**

### СТБ

**5.50** **Маст. фільм «Халодная гара».**
**8.25** «Скардзіца дазваляецца».
**8.45, 16.50** «Аўтапанарама».
**9.10** **Маст. фільм «Па сакрэце ўсяму свету».**
**11.10** «Вялікае снеданне».
**11.50** **«Салдаты або Добры дзень, рота, Новы год!». Серыял.**
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**13.40, 0.35** **Камедыя «Тры плюс два».**
**15.20** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**17.20** «Ваенная тайна».
**19.30** «Тыдзень».
**20.25** **Трылер «Дзённы дазор».**
**22.55** «Перасяленне на Марс». Дакументальны спецпраект.

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.15, 8.35** М/ф.
**7.00** **Маст. фільм «Залаты гусь».**
**8.05** «Нітка да ніткі».
**9.00** «Рэальнае ўсынаўленне».
**9.30, 5.25** «Чаму я?»
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Трэш-тэст».
**10.45** **Серыял «Сляпое шчасце».**
**14.10** **Маст. фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў».**
**16.15, 22.00** **Серыял «Яна не магла інакш».**
**21.00** «Разам».
**0.05** **Серыял «Маша ў законе».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Ха». Маленькія камедыі.
**7.45** **Маст. фільм «Выратаванае каханне».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**12.40** «Ранішняя пошта».
**13.20** М/ф.
**14.15** «Нанакаханне».
**15.10, 21.50** **Маст. фільм «Пенелопа».**
**20.00** Вeсткі тыдня.
**23.30** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 8.20** **Серыял «Таксістка».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Ядзім дома».
**10.20** «Першая перадача».
**11.00** «Цуд тэхнікі».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.20** «НашСпажыўНагляд». Не дай сябе падмануць!
**14.20** «Паедзем, паядзім!»
**15.05, 16.20** **Серыял «Двое з пісталетамі».**
**18.05** «Следства вялі...»
**19.20** **Серыял «Метэарыт».**
**22.45** **Маст. фільм «Фокуснік-2».**

### 8 канал

**9.00, 14.50, 19.00, 23.35** Надвор'е.
**9.05, 14.55** Мультпарад.
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.30, 14.40, 15.45, 21.00** «Хатняя крама».
**10.45** «Мой любімы гадавалец».
**11.15** **«Сінематограф». Камедыя «Закон ёсць закон».**
**12.45** **Меладрама «Нявеста і забабоны».**
**16.15** **Меладрама «Анкор, яшчэ Анкор».**
**18.00** «Хобі + ТВ». Рэаліці-шоу «Свой фермер».
**19.05** **Камедыя «Навагодні дэтэктыў».**



**20.50** «Вечарніца».
**21.05** **Трылер «Апакаліпсіс».**

### ВТБ

**6.00, 23.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Пінгвіняня Парапо».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00, 16.30** «Ералаш».
**9.00** «Вялікая маленькая зорка».
**10.00, 3.00** «Турбаміксер».
**12.00** Серыял «Як я стаў рускім».
**14.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**15.00, 19.30** «Уральскія пельмені».
**17.00** Камедыя «Вакол свету за 80 дзён».
**21.00** Баявік «Вяртанне героя».
**0.30** «Дурні і дарогі».
**1.00** Скетчком «Студэнты».
**2.00** Скетч-шоу «Мільёны ў сетцы».
**5.30** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**10.35** «Зусім сур'ёзна». Маст. фільм.
**11.30** «Сяргей Філіпаў». Дак. фільм.
**12.10** Дак. фільм «Часы года Антуана».
**12.45** «Расія, любоў мая!». «Беларусы ў Сібіры».
**13.15** «Хто там...».
**13.40** «Жывая Арктыка. Паўночны Ледавіты акіян. Царства холаду». Дак. фільм.
**14.35** «Што рабіць?».
**15.20** Геніі і ліхадзеі. Генрых Брокар.
**15.50** «Пешшу...». Масква ўсходняя.
**16.20** «Ход да глядзельнай залі... Вячаслаў Нявінны». Дак. фільм.
**17.00, 0.20** «Па запалкі». Маст. фільм.
**18.35** «Шукальнікі». «Прызнанне Фрола Разіна».
**19.25** «Аляксандр Абдулаў». Дак. фільм.
**20.00** «Шукайце жанчыну». Маст. фільм.
**22.30** «90 гадоў з дня нараджэння Герца Франка. «Флешбэк». Дак. фільм.
**2.00 — Прафілактыка.**

### Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Лепшае. 2009 год.
**6.50, 8.25, 9.40, 11.00, 12.30, 13.20, 14.45, 17.15, 18.45, 20.30, 21.35, 23.15, 0.50, 2.25, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.10** Маст. фільм «Дні лётныя».
**8.45, 2.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!»
**9.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00** «Колба часу».
**12.00** «Рок-н-рол ТБ». Музычная праграма. 1992 год.
**12.50** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...». Раман Карцаў.
**13.50** «Усё будзе так, як мы хочам!». VI Ленінградскі рок-фестываль. 1989 год.
**15.00** «Быў час». 2009 год.
**16.00** Маст. фільм «Каранцін».
**18.00** «Акулы пяра». Уладзімір Прасняков. 1998 год.
**19.10** «Зямля-Паветра». Валерый Кіпелаў. 2003 год.
**21.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Тацццяна Акунеўская.
**22.00** Маст. фільм «Зорка балета».
**0.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. 2014 год.
**1.20** Маст. фільм «Зазуля з дыпломам».
**4.00** «Народжаныя ў СССР».

### EuroSport 1

**2.30, 5.00, 10.15, 19.15** Зімовыя віды спорту.
**3.30, 1.00** Ралі-рэйд. Дакар.
**4.00** Снукер. Мастэрс.
**6.00, 8.30, 15.30, 20.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету FIS па палётах на лыжах.
**7.00, 9.45** Біятлон. Кубак свету.
**11.15, 14.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**12.30, 18.15** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**21.00** Снукер. Мастэрс. Фінал.
**1.30** Конны спорт. Кубак свету.

### Камедыя

**0.50, 18.00** Камедыя «Ёлкі 3».
**2.25, 19.40** Камедыя «К-9: Калядныя прыгоды».
**4.10, 21.30** Камедыя «Ёлкі. 1914».
**5.55, 12.10** Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
**7.45** Камедыя «Госць».
**9.10** Камедыя «Шалёныя грошы».



**10.45** Камедыя «Занудa».
**14.00** Камедыя «Што, калі Санта... зноў?».
**15.35, 17.30, 21.10** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Тарыф Навагодні».
**23.15** Камедыя «Елкі лахматыя».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.50, 5.40** «Дачныя гісторыі».
**10.15** «Нераскрытыя тайны».
**11.10** «Паненка і кулінар».
**11.45, 1.25** «Сямейны дэтэктыў». Серыял.
**15.10** «Жонка. Гісторыя кахання».
**16.30** «Каўчэг Марка». Серыял.
**19.55** «Без падману».
**20.45** Вялікае кіно: «Форэст Гамп».
**23.25** «Асцярожна, махляры!»
**23.55** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.20** «Зорныя таты». Дак. фільм.

### ТБ1000

**6.00** Меладрама «Жорсткія гульні».
**7.40** Камедыя «Сужэнцы Морган ва ўцёках».
**9.20** Камедыя «Сцюарт Літл».
**10.50** Драма «Маленькія жанчыны».
**12.50** Драма «Дзіяна: Гісторыя кахання».
**14.45** Камедыя «Мары спраўджваюцца!»
**16.30** Баявік «Напруж звіліны».
**18.20** Камедыя «Маціьльда».
**20.00** Меладрама «Да цуду».
**22.00** Драма «Не злоўлены, не злодзей».
**0.10** Драма «Сем гадоў у Тыбеце».
**2.30** Драма «Жнівень».
**4.40** Трылер «У нетрах кашмару».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Меладрама «Дзённік мамы першакласніка».
**7.45** Драма «Арда».
**10.05** Драма «Шык».
**11.45** Трагікамедыя «Яно».
**13.50** Баявік «На гульні 2. Новы ўзровень».
**15.25** Меладрама «Кахае не кахае».
**16.55** Камедыя «Карпаратыў».
**18.30** Меладрама «Чалавек каля акна».
**20.20** Драма «Экспірыенс».
**22.10** Баявік «Спіраль».
**0.00** Драма «Гарпастум».
**2.10** Драма «Ганна і камандор».
**3.30** Драма «Захоўвай мяне, мой талісман».
**4.50** Меладрама «Унук Гагарына».

### National Geographic

**6.00, 13.20** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**6.50, 12.40** Гульні розуму.
**7.35, 11.50, 17.10, 23.15, 2.15** Навуковы недарэчнасці.
**8.00** Золата Юкана.
**8.45** Навука будучыні.
**9.30** Сканеры старажытнага свету.
**10.20** Космас. Прастора і час.
**11.00** Рэстаўрацыя планеты Зямля.
**14.10** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**14.50** Дзікая прырода Амерыкі.
**15.40** Тайнае жыццё драпежнікаў.
**16.25** Суперзбудаванні старажытнасці.
**18.40, 22.30, 1.30, 5.15** Пячора гіганцкіх крышталяў.
**19.30** Разбагацей або памры на капальні.
**20.15** Ізумруд за 400 мільёнаў долараў.
**21.00, 0.00, 3.45** Золата: бясконцае вандраванне.
**21.45, 0.45, 4.30** Стафардшырскі скарб.

### Discovery

**6.00** Паляўнічыя за зброяю.
**6.50, 2.50** На краі Аляскі.
**7.45, 2.00** Голыя і напалоханыя.
**8.40** Зорнае выжыванне.
**9.35, 18.00** Залатая ліхаманка.
**12.20, 20.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**13.15, 21.00** Космас навывaрат.
**14.10, 22.00** Як уладкаваны Сусвет.
**15.05, 23.00, 3.40** Аляска: апошні рубеж.
**0.00** Хуткія і гучныя.
**1.00** Паляўнічыя на старызну.

■ Кінакрокі

# ЗДЫМАЧНАЯ НОЧ

## Як ствараюцца фільмы марознымі зімамі

**Працаваць у кіно складана. Вельмі. Паверце. У якой ступені, я зразумела, калі прыйшла ў якасці журналіста на здымачную пляцоўку тэлевізійнага фільма «Трымайся за аблокі», якая на дзве ночы (4 і 5 студзеня) размясцілася на Кастрычніцкай плошчы ля галоўнай ёлкі краіны. Студзень, як і мае быць, — марозны, тэрмометр паказваў -15, а на працу сабралася ўся здымачная група ды 200 чалавек акцёраў масоўкі. Працоўны дзень (ноч) павінен быў працягвацца да раніцы, работа распачалася недзе а чацвёртай дня, я апынулася тут а восьмай...**







...І ўбачыла той самы верталёт, пра які ўжо пісалі ў сацсетках і інтэрнэт-СМІ. Мінакоў здзіўляла прысутнасць на мінскай плошчы «еўракоптара» Міністэрства надзвычайных сітуацый, людзі пыталіся «Што тут робіцца?», некаторыя нават выказвалі занепакоенасць, што нешта здарылася. Тым часам прэс-сакратар МНС Віталь Навіцкі адказаў цікаўным карыстальнікам «Твітара», што верталёт патрэбен для здымак фільма. На плошчы ж былі відаць машыны нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» — так усё звязвалася ў лагічны ланцужок. Прахожыя з задаволенымі тварамі рабілі сэлфі на фоне верталёта, у сувязі з чым нарадзіўся жарт: яшчэ ўласна здымачная група не паспела яго зазняць, а верталёт ужо аказаўся «зоркай» дзясяткаў (ці нават сотняў) здымкаў.

**На Кастрычніцкай плошчы будуць паказаны фатальныя моманты знікнення і з'яўлення свята — для гэтага трэба, каб адначасова згаслі, а пасля «загарэліся» Палац Рэспублікі, Палац прафсаюзаў, калядная ёлка, — усе навакольныя будынкі і ілюмінацыя на плошчы.**

На Кастрычніцкай плошчы вялася праца над асобнымі эпізодамі апошняй серыі тэлефільма «Трымайся за аблокі». Праект карціны пра брыгаду «лэпаўцаў», г.зн. тых, хто працуе на лініях электраперадач, перамог у адкрытым рэспубліканскім конкурсе кінапраектаў мінулага года ў тэме «Пра актуальныя сацыяльныя праблемы жыцця сучаснай Беларусі». Не ў апошнюю чаргу дзякуючы пасылу «сапраўднымі героямі становяцца простыя людзі». У анатацыі заяўлена, што кіно гэтае пра мужчынскае сяброўства і ўзаемадапамогу. Вечныя каштоўнасці ў васьмі серыях паказвае рэжысёр Раман Гапанюк, вядомы па фільмах «Асаблівы выпадак» і «У сузор'і Стральца». На пляцоўцы аб рэжысёрах адзываюцца, як аб прафесіянале, які не грэбуе ўдзельнічаць ва ўсіх узроўнях працы над кінакарцінамі. Гісторыя пра тое, як для аднаго са сваіх фільмаў Раман Гапанюк уласнаруч выразаў таблічкі, намаляваныя дэкаратарамі, гэта пацвердзіла. Сам ён кажа, што здольны, напрыклад, шукаць патрэбную музыку 25 гадзін на суткі (пошук саўндтрэка для серыяла, дарэчы, пакуль яшчэ не завершаны), а вялікае, як вядома, складаецца з дробязяў.

Ахвярнасць, адданасць, энтузіязм — як ні назаві, кожны гэтымі марознымі начамі паказваў, што дзеля кіно можна быць здольным на многае. Добра падрыхтаваныя супрацоўнікі — у тэрмабялізне, часам у дзвюх вопратках (а можа, было і больш — не заўважыла) — прытупвалі, танцавалі, спявалі, часам нязлосна лаяліся, але — што больш надзейна — грэліся ў спецыяльных вагончыках, аўтобусах і пілі... гарачую гарбату і каву.

Праз некаторы час, праведзены на плошчы, змерзлыя пальцы пераcталі мяне слухацца, а працэнт зарадкі тэлефона ўвогуле сышоў на нуль, і той адключыўся ад пераахаладжэння. Верталёт усё стаяў, толькі агароджа вакол яго знікла. Здавалася, нічога не адбываецца, але гэта толькі здавалася — тым часам усталёўвалася асвятленне і апаратура, падбіраўся патрэбны ракурс, акцёры прадумвалі рухі, рэжысёр — сцэну. Праца ішла незаўважна.

Паводле сюжэта восьмай серыі, у горадзе перад самым Новым годам адключаецца электрычнасць, а галоўныя героі павінны знайсці месца аварыі і «выратаваць» надыходзячае свята. На Кастрычніцкай плошчы будуць паказаны гэтыя фатальныя моманты знікнення і з'яўлення свята — для гэтага трэба, каб адначасова згаслі, а пасля «загарэліся» Палац Рэспублікі, Палац прафсаюзаў, калядная ёлка, — усе навакольныя будынкі і ілюмінацыя на плошчы. Рэпетыцыі ў першую здымачную ноч паказалі, што арганізаваць гэта даволі складана.

Калі незаўважная праца была зроблена, нарэшце закруціліся лопасці верталёта. «Прагравaецца», — патлумачылі нам. Хутка здымачная група стала працаваць над сцэнай, у якой Дзед Мароз і два галоўныя героі бягуць па плошчы да верталёта, садзяцца ў яго і адлятаюць (верталёт падымаўся на пэўную вышыню і зноў садзіўся). Здаецца, дзякуючы мінусавай тэмпературы Аляксандру Дабравольскаму, што сыграў Дзеда Мароза (не пераапранутага мужчыну, а сапраўднага міфічнага героя), не спатрэбілася чырвоная фарба для шчок. «Мой персанаж злучае людзей, якія цэлы год баяліся прызнацца адно аднаму ў каханні, мой Дзед Мароз дорыць гэта каханне, — расказвае акцёр. — Я сустракаю двух герояў у аэрапорце і мы разам прылятаем на плошчу, дзе іх чакаюць сябры, і тады... я не магу выдаваць усе сакрэты, але скажу, што тут адбываецца галоўнае таемства, пакуль што скрытае ад будучых гледачоў».

**Прахожыя з задаволенымі тварамі рабілі сэлфі на фоне «еўракоптара», у сувязі з чым нарадзіўся жарт: яшчэ ўласна здымачная група не паспела яго зазняць, а верталёт ужо аказаўся «зоркай» дзясяткаў (ці нават сотняў) здымкаў.**

На пытанне, як праходзяць здымкі на марозе, Аляксандр (праўда, толькі што з цёплага аўтобуса) адказаў: «Пакуль яшчэ цудоўна: узляцелі, прызямліліся — каманда працуе, дарэчы, тут сабраліся вельмі добрыя і група, і рэжысёр (я ўдзельнічаў у шматлікіх здымках і магу параўноўваць). Казка працягваецца».



У здымках серыяла «Трымайся за аблокі» задзейнічаны рэальныя энергетыкі, пакуль у якасці дублёраў ды кансультантаў, а ўвесну яны, магчыма, сыграюць у фільме самых сябе. «Галоўныя героі — іх восем — па сюжэце перасякаюцца і кантактуюць з іншымі брыгадамі — вось дзе рэальныя прафесіяналы змогуць сыграць, — дзеліцца Раман Гапанюк. — Лэпаўцы дапамагаюць нам здымаць на палігонах, арганізуюць патрэбнае па сюжэце абясточванне, кансультуюць, мы выкарыстоўваем іх тэхніку, аварыйныя машыны, уніформу, каскі. Яны расказалі нам шмат гісторый».

Гісторыі гэтыя здольны раскрыць бяздонне простых-складаных прафесій. Неверагодны, напрыклад, трук вымушаны быў паказаць адзін лэпавец, што апынуўся на вышыні, якая пачала падаць — ён не разгубіўся і суразмерна з хуткасцю падзення змог па ёй збегчы ўніз і пераскочыць на трывалую глебу без адзінай драпіны. «Такі трук не паўторыш у фільме», — кажа рэжысёр.

Лопасці верталёта між тым зрабілі плошчу яшчэ больш халоднай і непрытульнай прасторай. Пайшоў невялікі снег — надвор'е для здымак навагодняй серыі было адпаведным. Дырэктар здымачнай групы Ірына Філіпава расказала пра занепакоенасць падчас планавання працы, бо яшчэ нядаўна на сталічных дарогах стаялі лужыны, а тэрмометр радаваў плюсавай тэмпературай. Штучны снег — гэта дадатковыя выдаткі, якія разлічваліся б ад працуючага «еўракоптара». На шчасце, перад самым Новым годам снег усё ж пайшоў.

**Праект карціны кінастудыі «Беларусьфільм» пра брыгаду «лэпаўцаў» перамог у адкрытым рэспубліканскім конкурсе кінапраектаў мінулага года.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

На Кастрычніцкай між тым меліся здымаць тое самае «галоўнае таемства», пра якое казаў Аляксандр Дабравольскі, вельмі падобнае да фіналу і серыі, і серыяла. Па плошчы размеркавалася масоўка, верталёт стаяў ужо на іншым месцы і маўчаў (але нядоўга), я паступова даходзіла да патрэбнай кандыцыі, каб памяняць здымачную пляцоўку на цёплае памяшканне. Кінематаграфісты ж гэтага зрабіць не маглі — іх чакала яшчэ некалькі гадзін працы. Акцёры селі ў верталёт, той закруціў лопасцямі, і снег стаў біць у твар. Калі я ўжо набліжалася да метро, ззаду пачуліся радасныя крыкі — галоўнае таемства фільма адбылося.

Якое — мы ўбачым летам 2017 года: тады выйдуць усе восем серый.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
katsyalovich@zviazda.by

**Больш фотаздымкаў — на сайце zviazda.by**




# СЯРМЯГА — НЕ ЗНЯВАГА, А ЖУПАН — НЕ ВЯЛІКІ ПАН

У кожнага чалавека ёсць, відаць, рэчы, якія помняцца ўсё жыццё. Раскажу пра свае.

...Страшэннай віхурай над нашай зямлёй пранеслася вайна. У яе агні загінулі маці і малодшая сястра; старэйшыя брат і сястра былі цяжка паранены.

Нічога не засталося ад нашай маёмасці. Ды што там — нават месца, дзе стаяла хаціна, было не пазнаць.

Але ж трэба было неяк жыць.

Пасля трохгадовага перапынку я пайшоў у восьмы клас сярэдняй школы. Ад яе да зямлянкі, дзе мы туліліся, было кіламетраў сем. Далёка, аднак не толькі гэта стала перашкодай: я не меў чаго надзець, горш за тое — у што абуцца. З апраткі хоць нешта магло перапасці ад старэйшага брата, а вось з абуткам...

Хадзіў босым.

Зрэшты, усе вучні тады апраналіся сціпла, але ж я ўсё роўна вылучаўся і адчуваў сябе крыху няёмка — асабліва ў святочныя дні.

...Я вучыўся ў дзясятым класе, калі бацька купіў мне штаны. Яны, відаць, былі трафейныя, ношаныя, да таго ж пашытыя немаведама з чаго і — дзіва дзіўнае, сорам! — з «маланкай» замест гузікаў...

Аднак нідзе не дзенешся: менавіта ў гэтых штанах я атрымліваў атэстат сталасці, менавіта ў іх здаваў экзамены ў педінстытут, пачынаў вучобу.

А далей бядой стала тое, што я памаленьку рос, а штаны мае, вядома ж, не: калошы ў іх якраз, наадварот, «збягаліся» ў дудачкі — ногі ледзьве ўлазілі. Да таго ж хлопцам я быў досыць жвавым, часта барукаўся са сваімі суседзямі (у пакоі было 17 студэнтаў)... У выніку штаны мае проста распаўзаліся, і я ледзь не кожны вечар зашываў ды цыраваў іх.

Так і хадзіў... Пакуль на курсе мае порткі не сталі свайго роду славутасцю, пакуль на іх не звярнуў увагі прафкам інстытута і, бачачы маё бядотнае становішча, не выдаў мне талон на новыя штаны.

І вось я іх набыў, прыбраўся і выйшаў на вуліцу. Божухна, які ж я быў шчаслівы! У новых штанах (звычайных, картовых, прычым купленых на вырост) былі шырокія калошы, якія (во цуд!) даставалі да зямлі. І ад гэтага я адчуваў, што ўжо вырас, што чалавек, амаль што мужчына...

З таго часу прамільгнулі не толькі гады, але і дзесяцігоддзі. Так атрымалася, што я ў сваім жыцці многа падарожнічаў, бываў у розных краінах Еўропы, Азіі, Афрыкі. Падчас гэтых паездак — не без таго — набываў сабе ды блізкім сваім самыя розныя рэчы. Але ніводная з іх не прынесла мне столькі радасці, колькі тыя простыя рабочыя штаны.

**Пётр Сачыўка,**
*в. Цырын, Карэліцкі р-н.*

# КАЛІ АДЛЯТАЮЦЬ «ЛАСТАЎКІ»

Новы год цяпер святкуецца з размахам. На сталах шампанскае ды розныя прысмакі, пад ёлкамі — дарагія падарункі...

У 60-х гадах мінулага стагоддзя іх таксама давалі — у школах. У кульках з газетнай паперы — грамаў па 150 «падушачак»... І нават гэта было ў радасць.

Да таго ж у клубе ўпрыгожвалася вялікая ёлка, і карагоды вакол яе вадзілі не толькі дзеці: па вечарах збіраліся дарослыя...

Ялінкі ўпрыгожвалі і ў хатах. Па замерзлым Дняпры нашы мужчыны хадзілі ў Ходасаўскі лес, на свой густ выбіралі дрэўцы і спакойна неслі дамоў, не баяліся, што аштрафуюць, — на гэта неяк «моды» не было.

А вось на што тая мода была, дык гэта на тое, каб ёлкі ўпрыгожваць разам, усёй сям'ёй, самаробнымі цацкамі. Гэта значыць, што дзеці разам з дзядулямі-бабулямі, разам з бацькамі загадзя сваімі рукамі выразалі сняжынкі і фігуркі жывёл, на кавалачкі ваты («снег») цярпліва насыпалі драбнютка парэзаную фольгу ці «дожджык» (каб блішчэла)...

Вешаліся на ёлкі і крамныя цацкі. А яшчэ — абавязкова — трохі цукерак (з думкай, вядома ж, хутчэй бы іх зняць...).

Якраз пра гэта мая гісторыя. Дык вось. Насупраць нашай хаты жыла тады маладая пара — Валянцін і Валянціна. Двое дзетак у іх. А ў бацькоў па-ранейшаму трохі ветру ў галаве — пагуляць ім хочацца, у кіно ці на канцэрт схадзіць.

У нянькі тады запрашалі мяне.

У той вечар, паклаўшы малых спаць, Валянцін з Валянцінай сабраліся ў клуб на ёлку. Мяне (гадоў пяць ці шэсць было) пакінулі ў хаце за галоўную. На ўсялякі пажарны паказалі, дзе якія соскі ляжаць і дзе якія бутэлечкі, далі паперу з алоўкам (я малявала дужа любіла). І нават сказалі, што, калі я захачу (?), то магу пачаставацца цукеркамі з іх ёлкі...

Як любіць паўтараць Міхаіл Задорнаў: «Дарэмна яны так сказалі», хаця б таму, што гаспадары, мусіць, не паспелі яшчэ за брамку выйсці, як я стала прыглядацца да ёлкі. І, вядома ж, адразу зразумела, што такіх цукерак, як там, яшчэ ніколі не бачыла: такіх не прыносіў нават Валодзька (гэта жаніх маёй старэйшай сястры. Бацькі казалі, што ён — хлопец харошы, за такога можна замуж ісці... «За Валодзьку і я з Маняй пайду, — заяўляла я. — Будзем жыць каля крамкі і кожны дзень прысмакі есці». Дзіцячы розум!)...

Я гэта да таго, што цукеркі на ёлцы былі асаблівыя: у бліскучых абгортках, з сінімі берагамі і з чорнай ластаўкай...

Як з галінак «пазляталі» першыя «птушкі», я нават не згледзела, — зняла яшчэ адну. Потым пахадзіла па пакоі, паразглядвала розныя карцінкі і фотакарткі, трохі пасядзела памалявала. Для парадку паглядзела малых Тому і Вову — сонным засунула па сосцы.

А тыя ж «ластаўкі» з ёлкі па-ранейшаму вабяць... Зняла яшчэ адну (бо мне ж не сказалі, колькі штук можна з'есці). Потым, заклаўшы рукі за спіну, абышла ёлку, хоць-нехаць заўважыла, што «прагаліны» (месцы без упрыгожанняў) моцна кідаюцца ў вочы. Каб ліквідаваць гэты недахоп, я вырашыла ўсе фанцікі павесіць назад на галінкі. Іх было столькі, што, у чарговы раз захацеўшы зняць «ластаўку», я перабрала, перамацала штук 10, але «птушкі» ніводнай не знайшла — спрэс «пустышкі».

Вось тут мне стала страшна ад думкі, што скажуць гаспадары. А што — мае бацькі?

Я пачала румзаць, потым плакаць уголас. Услед за мной разраўліся малыя.

Вось так, у слязах, мы і паснулі.



...Ні ўранні, ні пазней пра тую маю правіну ніхто нічога не сказаў. І глядзець тых дзяцей мяне па-ранейшаму запрашалі. Адно — каб на Новы год, не прыпомню.

Шмат часу прайшло з той пары. Многае забылася, многае — не. Мае падапечныя Тома і Вова і цяпер, здараецца, «прыпамінаюць», як я іх «выхоўвала».

Што было, тое было: і сварылася, і плескача калі-нікалі давала. Дык усё ж правільна: «старэйшых» трэба слухацца. А вось няньку даймаць, калі яна з іх цацкамі гуляе, наадварот, не трэба. Хаця б таму, што цацкі ж не цукеркі — іх не з'ясі.

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

# АПОШНЯЯ КРОПЛЯ?

Наш райцэнтр некалі быў звычайным мястэчкам, дзе на пачатак мінулага стагоддзя жыло шмат яўрэяў. Цяпер іх засталося хіба лічаныя адзінкі: многіх спалілі, забілі ў час вайны, многія памерлі, многія выехалі за мяжу. Чаму гэта адбылося — не зусім зразумела, бо людзі ўсіх нацыянальнасцяў (прынамсі ў нашым Беразіно) жылі як людзі: ніхто ніколі не зважаў на прозвішчы — кшталту Сідаровіч ты ці Сідараў, Ваванецкі ці Фрумкін... Але ж гэта — у Беразіно...

Адным з тых, хто выехаў з нашага мястэчка ў сярэдзіне 80-х, быў Міхаіл Міронавіч Клябанаў — на ўвесь раён знакаміты кравец з раённага Дома быту. Ён — стары халасцяк — жыў з матуляй і цалкам аддаваўся працы. Яго вельмі паважалі кліенты, ён заўсёды быў на добрым рахунку, прычым не толькі ў простых заказчыкаў, але і ў кіраўніцтва раёна , бо ўсім тады хацелася апранацца прыгожа і модна. А нешта прыстойнае купіць было цяжка. Людзі шылі на заказ, а значыць, звярталіся да Міхаіла Міронавіча і былі ўдзячны яму...

Дык вось аднойчы — ці не ў знак ўдзячнасці? — шаноўнаму краўцу далі пуцёўку ў Дом адпачынку, у Сочы. Не паехаць, не скарыстацца такой магчымасцю ён, вядома ж, не мог, бо падобнае надаралася гады ў рады — за надта вялікія заслугі альбо па такім жа вялікім блаце.

А таму спадар Клябанаў выбраўся ў дарогу. Даехаў, знайшоў там патрэбны дом, запоўніў дакументы на засяленне. І якраз вось тут пачаліся яго пакуты, бо дзяжурыла ў гэты дзень, мякка кажучы, нейкая бюракратка. Прачытала яна імя ды прозвішча ў пуцёўцы, потым — у пашпарце і ледзяным голасам прамовіла:

— Я вас засяліць не магу!

— Чаму? У чым справа? — не паверыў вушам адпачывальнік.

— А вось глядзіце: у пашпарце напісана, што Клябанава завуць Мойша Мееравіч, а ў пуцёўцы — што Міхаіл Міронавіч.

— Так... Але ж гэта адзін чалавек, гэта я.

— Імя і імя па бацьку не супадаюць!

— Як не супадаюць? Міхаіл Міронавіч — гэта той самы Мойша Мееравіч, толькі ў рускім варыянце.

— А засяляць вас як загадаеце?.. Адзін дакумент павінен адпавядаць другому, інакш нічога не выйдзе.

— І што мне рабіць? — бядуе спадар Клябанаў. — Назад вяртацца? Пуцёўка ж прападзе...

— Тэлефануйце альбо адпраўляйце дадому ліст, — параіла яму адміністратарка. — Хай вышлюць афіцыйнае пацвярджэнне, што абодва Клябанавы — гэта адзін і той жа чалавек. Пачакаць, праўда, прыйдзецца, але ж гэта лепш, чым нічога.

На той час ні мабільнікаў, ні факсаў яшчэ не было, таму беднаму адпачывальніку нічога не заставалася, як развярнуцца і пайсці на пошту.

Амаль тыдзень давялося яму чакаць патрэбнага пацвярджэння, і толькі потым з гасцініцы перасяліцца ў Дом адпачынку.

...Ці ездзіў пасля гэтага Міхаіл Міронавіч у падобныя падарожжы і якія дакументы браў з сабой, я не ведаю. Але пакрыўдзіцца — аж да намераў з'ехаць — ну, напэўна ж, мог.

**Анатоль Палынскі,**
*г. Беразіно.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

***АД ЯЕ Ж. На фінішы прамінулага (прычым — куляй...) года вельмі хацелася шчыра падзякаваць усім, хто чытаў нашы «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі» і, вядома ж, усім, хто дасылаў іх, назваць прозвішчы самых актыўных аўтараў...***

***Для таго, каб не памыліцца ў выбары, «падняла» падшыўку і, ці паверыце, паўдня — як карова языком злізала, бо шмат за што, як той казаў, зачапілася вокам — многія з гісторый захацелася перачытаць. Каб яшчэ раз ад душы пасмяяцца! Каб потым... канчаткова разгубіцца і зразумець, што найлепшых аўтараў вызначыць проста немагчыма! У прыватнасці — аднаму. Хіба... з дапамогі іншых?***

***А таму ў новым годзе — новае пачынанне. Кшталту: вы прачыталі першую падборку гісторый? Калі ласка, не палянуйцеся — ацаніце кожную з іх: на «троечку», на «двоечку», на «чацвёрачку» (як у школе калісь... Найвышэйшая адзнака — «пяць») і пакладзіце выразку з газеты (альбо цэлы нумар) у нейкую шуфлядку. Праз тыдзень-другі ў газеце, дасць Бог, з'явіцца новая падборка і — адпаведна — вашы новыя адзнакі.***

***Такім чынам напрыканцы года (вечары ўзімку доўгія) вам застанецца адкрыць тую чароўную шуфлядку, нешта, магчыма, яшчэ раз перачытаць і, выбраўшы дзесяць — на ваш погляд — найлепшых гісторый, паведаміць пра іх (назва, дата публікацыі) у рэдакцыю. А ўжо тут...***

***Тут і ў самы бліжэйшы час, апроч вялікага чытацкага журы, пачне работу яшчэ адно — рэдакцыйнае. А ў выніку на фінішы 2016-га мы зможам смела назваць і найлепшыя «байкі», і прозвішчы іх аўтараў з усімі, як той казаў, наступствамі ў выглядзе кампліментаў, адмысловых прызоў і дыпломаў...***

***І, вядома ж, дасылайце свае гісторыі. Як сведчыць жыццё, запас іх — проста невычарпальны!***

Дэпартамент па каштоўных паперах
Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь
**ЗАРЭГІСТРАВАНА**
30 снежня 2015

**УТВЕРЖДЕНО**
Внеочередным Общим собранием Участников
СП «Сельскохозяйственные услуги» ООО
08.12.2015 (Протокол № 24)

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ОБЛИГАЦИЙ ПЯТОГО ВЫПУСКА

Белорусско-литовского совместного предприятия «Сельскохозяйственные услуги»
общества с ограниченной ответственностью (СП «Сельскохозяйственные услуги» ООО)

**1. Подпункт 2.5.1 пункта 2.5. изложить в следующей редакции:**

**«2.5. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.**

В качестве обеспечения исполнения обязательств эмитента по облигациям выступает:

2.5.1. Поручительство Закрытого акционерного общества «Облрапсагросервис» в объеме 3 116 180 (Три миллиона сто шестнадцать тысяч сто восемьдесят) долларов США согласно договору о предоставлении поручительства № 1 от 02.12.2015.

Место нахождения поручителя: 222610, Республика Беларусь, Минская область, Несвижский район, городской поселок Городея, улица Вокзальная, дом № 23А, здание бытового помещения.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 691151549.

Номер телефона поручителя: 8 (01770) 5-75-98.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.07.2015 составляет 59 878 млн белорусских рублей, на 01.10.2015 – 60 320 млн белорусских рублей.»

**2. Абзац первый – пятый подпункта 2.5.2. пункта 2.5. изложить в следующей редакции:**

«2.5.2. Поручительство Совместного закрытого акционерного общества «РапсКлецк» в объеме 2 508 820 (Два миллиона пятьсот восемь тысяч восемьсот двадцать) долларов США согласно договору о предоставлении поручительства № 2 от 02.12.2015.

Место нахождения поручителя: 222531, Минская область, город Клецк, улица Первомайская, дом № 2, комната №104.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 690608598.

Номер телефона поручителя: 8 (01793) 5-29-36.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.07.2015 составляет 44 388 млн белорусских рублей, на 01.11.2015 – 44 403 млн белорусских рублей.»

**3. Пункт 1.6. изложить в следующей редакции:**

«1.6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента, его место нахождения, дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего, номер специального разрешения (лицензии) на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, срок действия лицензии.

Наименование депозитария: Закрытое акционерное общество «Агрокапитал» (далее – депозитарий);

Место нахождения депозитария: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, ул. Революционная, 6 «В».

Депозитарий зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом решением от 18.08.2000 года № 931 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101000004.

Специальное разрешение (лицензия) № 02200/5200-1246-1097 на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выданное Министерством финансов Республики Беларусь и действительно до 29 июля 2022 года.»

**4. Абзац тринадцатый подпункта 2.5.2. пункта 2.5. изложить в следующей редакции:**

«Владелец (владельцы) облигаций обязаны осуществить перевод облигаций, в отношении которых были исполнены обязательства по погашению облигаций на счет «депо» эмитента не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления на счет владельца (владельцев) облигаций денежных средств по исполненным обязательствам по следующим реквизитам:

переводополучатель – СП «Сельскохозяйственные услуги» ООО, счет депо № 6000335;

депозитарий переводополучателя – ЗАО «Агрокапитал», код депозитария D01, корреспондентский счет «депо» лоро – 1000101;

назначение перевода – перевод ценных бумаг на счет «депо» эмитента для целей их погашения.»

От эмитента:
И.о. Генерального директора
СП «Сельскохозяйственные услуги» ООО О. И. Волков

Главный бухгалтер
СП «Сельскохозяйственные услуги» ООО М. Г. Трубкина

От профессионального участника рынка ценных бумаг:
Директор Унитарного предприятия
по операциям с ценными бумагами «Внешпромтрейд» Е. Ю. Новик

# У ГОСЦІ ДА ДЗЯЦЕЙ

## Удзельнікі Каляднага турніру наведалі Радашковіцкую школу-інтэрнат

**Акцыя «Калядная традыцыя» ўжо каторы год праходзіць у рамках хакейнага турніру аматараў на прызы кіраўніка дзяржавы. Яе арганізатарамі з'яўляюцца Прэзідэнцкі спартыўны клуб і Федэрацыя хакея Беларусі, а геаграфія ўдзельнікаў усё пашыраецца.**

На гэты раз хакеісты адправіліся ў Радашковіцкую школу-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, там выхоўваюцца 86 чалавек ва ўзросце ад 5 да 18 гадоў. Дзеці некалькі дзён рыхтаваліся да сустрэчы гасцей: хтосьці з іх спявае, хтосьці танцуе, хтосьці займаецца вырабам прыгожых падарункаў сваімі рукамі, таму сустрэча атрымалася цёплай, вясёлай і з сюрпрызамі.

Яны, дарэчы, чакалі не толькі дзяцей, але і замежных гасцей: дзеці падрыхтавалі для іх падарункі, святочны канцэрт і экскурсію па двух музеях, якія знаходзяцца на тэрыторыі школы-інтэрната (краязнаўчы і музей паветраных і вогненных таранаў).

На сродкі, пералічаныя Прэзідэнцкім спартыўным клубам і Федэрацыяй хакея Беларусі, школа-інтэрнат ужо паспела абсталяваць манаблокамі камп'ютарны клас, а таксама закупіць і ўсталяваць у жылых карпусах душавыя кабіны. У планах яшчэ набыццё школьнай і мяккай мэблі, розных набораў, якія навучаюць і развіваюць дзяцей. Акрамя таго, у спісе падарункаў ад замежных спартсменаў — тэлевізары і ноўтбукі, праектары і гукавыя ўстаноўкі, сапраўдная баксёрская груша з пальчаткамі і тэнісны стол. Каманда Прэзідэнта таксама вырашыла падтрымаць спартыўную пераемнасць — хакеісты прывезлі дзецям канькі: хакейныя і фігурныя.

— Падарункі, увага, дапамога — гэта толькі малая частка таго, што заслугоўваюць дзеці. Нам спадабаліся і канцэрт, і краязнаўчы музей. Дзеці малайцы і, спадзяюся, наш візіт ім запомніцца, — адзначыў **нападаючы хакейнай каманды Прэзідэнта Беларусі Алег АНТОНЕНКА.**

Ну а галоўнае — усе ўдзельнікі акцыі змаглі падарыць дзецям часцінку цяпла і адчування таго, што цуды здараюцца. Спартсмены гутарылі з дзецьмі ў навучальных класах і знаёміліся з побытам выхаванцаў у іх пакоях, расказвалі цікавыя гісторыі і разам малявалі, пакідаючы свае добрыя пажаданні на сімвалічных «далонках» з паперы. Ужо звыклым у гэтым мерапрыемстве стаў абмен адрасамі, бо цуды і «Калядная традыцыя» павінны працягвацца.

Такая добрая справа распачата арганізатарамі ў 2013 годзе, тады ў рамках 9-га Каляднага міжнароднага турніру арганізатары і каманды-ўдзельніцы ўпершыню аб'ядналіся, каб падарыць трохі радасці і каляднага цуду тым, хто так гэтага чакае: дзецям.

За ўсю гісторыю акцыі яе пачынальнікі аказалі дабрачынную дапамогу сямі сацыяльна-педагагічным цэнтрам Мінска, дзіцячаму дому сямейнага тыпу Мінскага раёна, дзіцячаму гарадку Ленінскага раёна Мінска і дзіцячай вёсцы «Вытокі». Усяго ў гэтых установах сёння пражывае і выхоўваецца каля 400 хлопчыкаў і дзяўчатак.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*



## ■ Неасабісты суб'ектыў

# МЕСЦА ПАД СОНЦАМ



## Пра паваленыя елкі, хлопцаў з бензапілой і чалавечую крыўду

ЖЫХАРАМ нашага мікрараёна пашанцавала: зусім побач, па абодва бакі дарогі — сапраўдны лес. З вялізнымі змрочна-зялёнымі ялінамі, зараснікамі маліннiку і ўсюдыіснымі вавёркамі, якія сталі зусім рахманымі, толькі што на калені не просяцца. Лес, зразумела, акультураны: паўсюль дарожкі, лавачкі, нават дзіцячыя пляцоўкі з горкамі ды гушкалкамі. Выдатнае месца адпачынку, асабліва для маладых мам з малымі ды для старых, якіх, калі заканчваецца дачны сезон, у навакольных дамах збіраецца нямала — вяртаюцца ў свае гарадскія кватэры ці прыязджаюць «на зімоўку» з вёскі да дзяцей.

Пра «лясное жыццё» гэтай катэгорыі я ведаю нямала і, як той казаў, з першых вуснаў: ці не штодня на прагулку выбіраецца мама. Там у іх, як і ў маладых, — свая «тусоўка». Павольна ходзяць грамадой па дарожках, спыняюцца адпачыць на лаўках, успамінаюць маладосць, абмяркоўваюць апошнія навіны, «выхоўваюць» маладых мам, якія кураць, ці падлеткаў, што не прыбіраюць за сабой смецце. Сапраўды адводзяць душу, бо дома — або чаканне вечна занятых дзяцей з работы, або зацятая адзінота.

НЯДАЎНА ў іх з'явіўся новы «пункт збору». На прагаліне ад моцнага ветру вельмі ўдала ўпалі-злажыліся побач дзве вялікія елкі. Спачатку бабулі прысаджваліся на гладкія камлі проста адпачыць. Але потым іхнія «хлопцы» ўзяліся за справу сур'ёзна — прынеслі з дому неабходныя інструменты, пакрыжавалі тыя паваленыя дрэвы, густа набілі на іх дошчачак. Атрымалася шырокая дыхтоўная лаўка, на якой хапала месца ўсім — там можна было сесці нават у два рады — спіна да спіны. Побач на дрэвах развесілі адмысловыя кармушкі, і кожны прыносіў у кішэні якога зерня ці крошак. І хораша, і ўтульна было сядзець у зацішку пад птушынае цiўканне ды вавёрчына цоканне.

Галоўным ініцыятарам і самым актыўным удзельнікам стварэння гэтага куточка быў дзядзька Міша — немалады, але яшчэ даволі моцны мужчына. Жыве ён адзін, дзеці недзе раз'ехаліся, жонку пахавалі летась, вельмі перажываў гэту страту. Магчымасць зрабіць штосьці карыснае для іншых нібы вярнула яго да жыцця. Не раз даваўся чуць, з якім энтузіязмам і стараннасцю рабіў ён тую лаўку і кармушкі, як змайстраваў побач адмысловую сметніцу, як сачыў за парадкам вакол — самаробная лаўка стала любімым месцам адпачынку і для маладых наведвальнікаў лесу.

АЛЕ зберагчы тую лаўку дзядзьку Мішу так і не ўдалося. Не ад падлеткаў-хуліганаў — у тых рука паднімалася хіба што смецця вакол панакідаць. Ад службаў, якія за парадак у лесапарку адказваюць. Акурат перад навагоднімі святамі прыйшлі хлопцы ў спецадзенні з бензапілой, пазбівалі тыя старанна набітыя дошчачкі, а паваленыя дрэвы парэзалі на цуркі. На слабыя пратэсты тых, хто гэта бачыў (а рабілі ўсё з самай раніцы), катэгарычна адказалі: паваленыя дрэвы тут ляжаць не павінны. Парэзалі, кінулі і пайшлі. Старыя, што сабраліся ўдзень, убачылі сваё раскіданае гняздо: замест дыхтоўнай лаўкі — трэскі, пілавінне, і... тыя самыя цуркі, якія ніхто не спяшаўся прыбраць...

Казалі, дзядзька Міша злаваўся, крычаў, а ў вачах стаялі слёзы крыўды. Пасля развярнуўся і пайшоў дадому — ледзь соваючы ногі, нібы згорбіўшыся ад цяжару, што нечакана навалiўся на плечы. Стары, стомлены чалавек. Больш ён у лес не прыходзіў. Бабулі хваляваліся: ці не злёг?

Абураныя кабеты спачатку нават на «прамую лінію» ў гарвыканкам хацелі пазваніць. Пасля, разважыўшы, раздумалі. Фармальна ж тыя хлопцы ў спяцоўках нічога не парушылі. Атрымалі загад папілаваць паваленыя дрэвы — прыйшлі і папілавалі (хоць напрошваецца пытанне — чаму ён так доўга выконваўся, што елкі ўжо паспелі паляжаць, прыцягнуць увагу людзей, што ходзяць міма, ператварыцца ў абжытае месца адпачынку?). Усё астатняе — зацішак, дзе старыя людзі адаграваліся душой, кармушкі, сінічкі ды вавёркі — гэта, шаноўныя, лірыка, яе да акта выкананых работ не прышпіліш. Як і спагадлівасць, чалавечнасць, элементарную логіку і рацыю (відаць жа было, што акультурваць тое месца не трэба, яго ўжо і так акультурылі, выкарыстаўшы падручныя сродкі). «Уключаць» названыя якасці, уласцівыя любому нармальнаму індывіду, — справа для некаторых вельмі клапотная і нязручная. І добра, калі гэта проста супрацоўнікі камунальнай службы, ад якіх залежыць лёс усяго толькі адной лаўкі (хаця, калі паглядзець глыбей, дык і здароўе чалавека)...

АДЗЯДЗЬКА Міша ў лесе зноў з'явіўся. Змайстраваў новыя кармушкі, паразвешваў на дрэвах. «Дурные слуги случаются во всяком доме», — з усмешкай адказвае ўсім, хто згадвае тую гісторыю з лаўкай. Нават дзіўна, як дарэчы словы іспанца Лопэ дэ Вега, што жыў амаль пяцьсот гадоў таму, на нашу рэчаіснасць кладуцца.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by* ■

## ■ Падзея

# ГАРАЧЫЯ БАТАЛІІ НА ХАЛОДНЫМ ЛЁДЗЕ

### Мінск зноў прымае вялікі спартыўны турнір

**У шматфункцыянальным спартыўна-забаўляльным комплексе «Мінск-Арэна» сёння стартуе чэмпіянат Еўропы па канькабежным спорце. Падобны турнір праходзіць у нас у краіне ўпершыню, але тое, што ён увойдзе ў гісторыю, вядома ўжо цяпер — гэта апошняе кантынентальнае першынство, пераможца якога вызначыцца па суме класічнага мнагаборства. Акрамя свайго спартыўнага складніка, спаборніцтвы абяцаюць стаць сапраўдным святам для жыхароў Беларусі і гасцей нашай краіны.**

Чэмпіянат Еўропы ў Мінску збярэ найлепшых канькабежцаў з 17 краін, у спісе ўдзельнікаў пераможцы і прызёры алімпійскіх гульняў і чэмпіянатаў свету. Усяго ў Беларусь прыехала больш за 30 спартсменаў з такіх вядучых дзяржаў у канькабежным спорце, як Галандыя, Нарвегія, Расія і Чэхія. Чакаецца, што ў якасці ганаровых гасцей турнір наведаюць легенды гэтага віду спорту Лідзія Скобліква, Валерый Муратаў, Ігар Жалязоўскі і іншыя.

### Апраўдаць давер

Сама арэна і веладром ужо не раз прымалі топ-турніры, а вось спаборніцтвы такога ўзроўню для канькабежнага стадыёна сталіцы стануць дэбютам. На іх ужо прайшлі два этапы кубка свету сярод юніёраў, пасля чаго, дарэчы, Міжнародная федэрацыя і прыняла рашэнне аддаць чэмпіянат Еўропы Мінску. «Мы перакананы, што сёння наша каманда арганізатараў зроблена ўсё, каб турнір прайшоў паспяхова», — адзначае **старшыня Беларускага саюза канькабежцаў Мікалай АНАНЬЕЎ.** Ён таксама выказаў надзею, што пасля добрага правядзення чэмпіянату Старога кантынента Міжнародная федэрацыя даверыць Беларусі і больш буйныя турніры, напрыклад, адзін з этапаў Кубка свету, дзе колькасць удзельнікаў даходзіць да 200 чалавек.

### Спорт як свята для ўсёй сям'і

Спаборніцкая частка турніру пачынаецца толькі сёння, а вось свята для аматараў спорту доўжыцца ўжо некалькі дзён. Бо фан-зона каля «Мінск-Арэны» пачала працаваць яшчэ 7 студзеня. Паколькі час правядзення турніру прыпаў на калядныя выхадныя, арганізатары паклапаціліся не толькі аб захапляльных спаборніцтвах, але і аб актыўным адпачынку заўзятараў. У фан-зоне кожны можа знайсці занятки па душы. Там арганізаваны забавы для ўсіх узростаў: як для дзяцей, так і для заўзятараў са стажам. Танцавальныя і вакальныя конкурсы, канцэрты альтэрнатыўнай музыкі, катанне на ролікавых коньках — усё гэта дапамагае адчуць атмасферу спартыўнага свята. Гулянні суправаджае талісман спаборніцтваў — снегавік, а дадаткова стымул заўзятарам надаюць розыгрышы прызоў. Асаблівы каларыт святу прыдаюць і стравы беларускай кухні, якія карыстаюцца ў гэтыя дні асаблівай папулярнасцю сярод замежных гасцей. Іх, дарэчы, даволі шмат: квіткі на мінскі чэмпіянат Еўропы ў Галандыі, напрыклад, сталі раскупляць яшчэ ўлетку. Кошт запаветнага прапуску на трыбуны невысокі, квіток за 30 тысяч дазволіць атрымаць уваход на канькабежны стадыён на ўвесь дзень, але без права месца на трыбуне. Кошт квітка з месцам для дзіцяці або студэнта на цэлы дзень складае 50 тысяч, а для дарослага — 100 тысяч рублёў.



### Нашы надзеі

На турніры выступяць наймацнейшыя спартсмены з вядучых дзяржаў у канькабежным спорце (у складзе зборнай Чэхіі, напрыклад, на лёд выйдзе алімпійская чэмпіёнка). Беларусь прадстаўлена на спаборніцтвах траімі спартсменамі — гэта максімальны ліk канькабежцаў ад краіны. Колеры нашага сцяга будуць абараняць Марына Зуева, Таццяна Міхайлава і Віталь Міхайлаў. Галоўны трэнер нацыянальнай каманды Сяргей Мінін адзначае, што звышзадачы перад спартсменамі не стаіць, ім трэба паказаць годны вынік, на які здольны кожны з іх. «Сёлета нашы канькабежцы прыкметна прагрэсуюць, пра гэта сведчаць і лічбы: пабіта 12 нацыянальных рэкордаў. Яны паказваюць добрую хуткасць, і задача нашых прадстаўнікоў у першую чаргу зрабіць гэта і на хатнім чэмпіянаце. Добрым вынікам мы будзем лічыць, калі трапім у першую васьмёрку», — расказаў галоўны трэнер.

Адзначым, яшчэ і тое, што з мая са спартсменамі нашай зборнай пачаў працаваць галандскі спецыяліст Сіп Хаекстра. Выбар на трэнера з Нідэрландаў упаў невыпадкова, бо менавіта спартсмены гэтай краіны на мінулых зімовых Алімпійскіх гульнях выйгралі практычна ўсе залатыя ўзнагароды ў канькабежным спорце. «Падчас падрыхтоўкі ў нас ўзнікалі спрэчкі, паколькі ўсё ж адрозніваецца філасофія Нідэрландаў і Беларусі. Цяпер яшчэ занадта рана казаць пра медалі беларускіх канькабежцаў, але, безумоўна, іх вынікі становяцца лепшымі, спартсмены растуць», — адзначае Сіп.

Урачыстая цырымонія адкрыцця адбудзецца сёння ў 14.30, пасля чаго пачнецца спаборніцкая праграма. Заўтра на лёд канькабежнага стадыёна спартсмены выйдуць у 15.00.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by* ■

■ Літаратурнае пабрацімства

# СЯБРОЎСТВА — ШЛЯХ ДА ЎДАЧЫ

**У Саюза пісьменнікаў Беларусі нямала замежных сяброў, якія з'яўляюцца членамі беларускага творчага аб'яднання.**



Гэта паэты і празаікі з Азербайджана і Арменіі, ЗША і Расіі, Таджыкістана і Літвы... Адзін з такіх добрых сяброў беларускай літаратуры — дзіцячы пісьменнік з Літвы Яронімас Лаўцюс. Днямі яму споўнілася 70 гадоў. Сувязь з Беларуссю ў літоўскага творцы, які хутка як 30 гадоў з'яўляецца галоўным рэдактарам дзіцячага часопіса «Зорачка», самая што ні ёсць трывалая. Па-першае, у Мінску ўжо болей як два дзесяцігоддзі выходзяць кнігі Яронімаса Лаўцюса — і на беларускай, і на рускай мовах. Па-другое, штогод літоўскі пісьменнік удзельнічае ў Днях беларускага пісьменства і ў традыцыйных лютаўскіх кніжных выстаўках у Мінску. І імкнецца прапагандаваць не толькі літоўскую літаратуру, сваю ўласную творчасць, а робіць усё магчымае, каб у беларускай і літоўскай дзіцячых літаратур быў трывалы мост дружбы. За такую працу Саюз пісьменнікаў Беларусі адзначыў літоўскага калегу медалём «За вялікі ўклад у літаратуру».

— Мне вельмі прыемна бываць у Мінску, — гаворыць Яронімас Лаўцюс. — Выдавецтвы, з якімі я сябрую, — і «Адукацыя і выхаванне», і «Пачатковая школа», і «Мастацкая літаратура», — вельмі ўважлівыя да юнага чытача. Гэта сведчыць пра сістэмную дзяржаўную палітыку ў галіне выхавання юнага пакалення. Друкаванае слова знаходзіць у вас шырокую дзяржаўную падтрымку. Я ведаю, колькі выдаецца літаратуры па сацыяльных дзяржаўных заказах, той літаратуры, што зарыентавана на выхаваўчы, адукацыйны працэсы. Мне імпануе, што такія маральныя катэгорыі, як дабрыня, дружба народаў, міралюбівыя памкненні ў фарміраванні дзяржаўнай палітыкі з'яўляюцца складнікамі выхавання і адукацыі. Таму з радасцю пішу кнігі менавіта з разлікам на беларускага чытача.

А сярод клопатаў, звязаных у Яронімаса з прапагандай беларускай літаратуры ў Літве, — і арганізацыя прэзентацый беларускіх кніг у Вільнюсе, і выпуск кніг беларускіх дзіцячых пісьменнікаў у перакладзе на літоўскую мову, і прадстаўленне паэтаў, празаікаў Беларусі ў часопісе «Зорачка». Такое сяброўства сёння як ніколі шмат значыць.

**Сяргей ЗАЛАМАЙ**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.25 | 17.08 | 7.43 |
| Віцебск — | 9.22 | 16.51 | 7.29 |
| Магілёў — | 9.16 | 16.58 | 7.42 |
| Гомель — | 9.04 | 17.03 | 7.59 |
| Гродна — | 9.39 | 17.25 | 7.46 |
| Брэст — | 9.32 | 17.33 | 8.01 |

## Месяц

*Апошняя квадра 02.01-09.01. Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

***Пр.** Сцяпана, Фёдара. **К.** Тэрэзы, Адрыяна, Юльяна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




■ Святочныя рэкорды

# ЯК БЕЛАРУСЫ ВІНШАВАЛІ АДНО АДНАГО ПАД НОВЫ ГОД?

**Трэнды, якія назіраліся ў апошнія гады, сталі яшчэ больш відавочнымі: віншуючы родных і блізкіх, людзі ўсё больш звяртаюцца да інтэрнэт-сэрвісаў і ўсё менш — да звыклых SMS-паведамленняў.**

Хуткі рост цікавасці да смартфонаў і мабільнага інтэрнэту, у прыватнасці да сацыяльных сетак і месенджараў, прадвызначыў новы рэкорд па трафіку. За 31 снежня і 1 студзеня, напрыклад, абаненты МТС згенеравалі парадку 120 тэрабайт даных — на 30% больш, чым год таму. Такім чынам, кожную секунду праз сетку МТС праходзіла 714 мегабайт трафіку. Дарэчы, на сеткі стандартаў 3G і 4G прыпала 95% гэтага аб'ёму, а на хуткасных LTE мінчане спампавалі ў Новы год 6,5 тэрабайта.

«Галасавая» актыўнасць абанентаў МТС у Новы год захавалася на леташнім узроўні. За апошні дзень 2015-га і першы дзень 2016 года яны нагаварылі амаль 98 мільёнаў хвілін, гэта значыць каля 68 тысяч дзён ці 186 гадоў. Кожную секунду абаненты МТС здзяйснялі і прымалі 646 званкоў. Пікавая актыўнасць, як і ў папярэднія гады, прыпала на позні вечар 31 снежня і ноч 1 студзеня.

Інтэнсіўнае развіццё мабільнага інтэрнэту і сэрвісаў абмену паведамленнямі лагічна адбілася на колькасці адпраўленых SMS. У свята абаненты МТС напісалі прыкладна на 15% менш традыцыйных паведамленняў, чым год таму. Зрэшты, SMS-паказчык усё яшчэ застаецца больш чым проста значным: за 31 снежня і 1 студзеня кліенты аператара абмяняліся 12 мільёнамі міні-лістоў, гэта значыць, што адпраўлялі амаль па 80 SMS за секунду.

Абаненты Velcom 31 снежня і 1 студзеня нагаварылі больш як 157 млн хвілін (уваходныя і выходныя званкі). Пік галасавога трафіку прыпаў на 11 раніцы 31 снежня і поўнач (7 млн і 8 млн хвілін адпаведна). Пік адпраўкі SMS быў у навагоднюю ноч: з 23.00 да 1 гадзіны адпраўлена больш за 2,6 млн SMS.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Анонс

## МІЖНАРОДНАЯ «СНЯЖЫНКА»

**У Віцебску пройдзе адзін з найстарэйшых на постсавецкай прасторы конкурс спартыўных бальных танцаў.**

— У XXXI конкурсе спартыўных бальных танцаў «Віцебская сняжынка — 2016» возьмуць удзел выканаўцы з 16 краін свету. Сярод іншых выступяць прадстаўнікі Мальты, Ізраіля, Італіі, Латвіі... Спаборніцтвы адбудуцца ў пяці ўзроставых катэгорыях з еўрапейскай і лацінаамерыканскай праграмамі. Свята танца пройдзе 23 і 24 студзеня, — паведамілі «Звяздзе» ў «Цэнтры культуры «Віцебск».

Гледачы ўбачаць і паказальныя выступленні чэмпіёнаў свету па лацінаамерыканскім шоу, і музычны рынг паміж дыджэямі з Эстоніі і Швецыі. Што цікава, кошт самых дарагіх квіткоў дэмакратычны — усяго 120 тысяч рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## УСМІХНЕМСЯ

**Запіс у дзённіку сына: «Угаварыў настаўніцу малявання пазіраваць на ўроку!»**

Пятніца, позні вечар пасля навагодніх свят, лавачка каля дома. На ёй сядзяць два прыяцелі, побач амаль пустая бутэлька з-пад гарэлкі, абодва практычна ніякія. Адзін з іх ужо амаль спіць, другі з цяжкасцю гартае нейкі часопіс. Потым падымае галаву і звяртаецца да прыяцеля:

— Мікола, ты хто па гараскопе?

— Я? Ну гэты, як яго... Цялец, во!

— Вось халера, і я Цялец! Нам сёння гараскоп прарочыць незвычайную прыгоду.

— Ды хлусіць твой гараскоп...

Тут з-за кустоў выходзіць нарад міліцыі і, усміхаючыся:

— Не, грамадзяне, не хлусіць...




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

Даты | Падзеі | Людзі

## 9 СТУДЗЕНЯ

**1801** год — 215 гадоў таму нарадзіўся (Вялікая Бераставіца, цяпер Гродзенская вобласць) Восіп Міхайлавіч Кавалеўскі, гісторык, адзін з заснавальнікаў мангалазнаўства ў Расіі, акадэмік Пецярбургскай АН (1847), прафесар (1834). У 1821 годзе скончыў Віленскі ўніверсітэт, выкладаў у Віленскай гімназіі польскую, грэчаскую, лацінскую мовы, займаўся навуковай дзейнасцю. У 1825-м быў арыштаваны за ўдзел у таемных таварыствах і высланы ў Казань, дзе ў мясцовым універсітэце вывучаў усходнія мовы (татарскую, фарсі, арабскую). У 1829—1830 гг. Пабываў у Манголіі і Кітаі. У 1833-м вярнуўся ў Казань, прывёз багаты зборнік слоўнікаў, рукапісаў па гісторыі, філасофіі, рэлігіях Усходу на мангольскай, тыбецкай, кітайскай і маньчжурскай мовах. Чытаў лекцыі па гісторыі і мове Манголіі ў Казанскім універсітэце, загадваў першай у Еўропе кафедрай мангольскай мовы. У 1855—1860 гг. — рэктар Казанскага ўніверсітэта. Пазней быў вызвалены ад пасады ў сувязі са студэнцкімі хваляваннямі. З 1862 года — у Варшаве, чытаў лекцыі па ўсеагульнай гісторыі ў Галоўнай школе. Аўтар прац па мангалазнаўстве. Лаўрэат прэстыжнай Дзямідаўскай прэміі Пецярбургскай АН. Памёр у 1878 годзе.

**1890** год — нарадзіўся Карэл Чапек, славуты чэшскі пісьменнік. Аўтар раманаў «Фабрыка Абсалюта», «Вайна з саламандрамі», п'ес «Белая хвароба», «Маці», «Сродак Макропуласа» і іншых твораў.

**1902** год — нарадзіўся (вёска Збляны, цяпер Зэльвенскі раён) Антон Раманавіч Жэбрак, беларускі генетык і селекцыянер, грамадскі дзеяч. Акадэмік АН Беларусі (1940), доктар біялагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. У 1940—1947 гадах — член Прэзідыума АН Беларусі, у 1947-м — прэзідэнт Акадэміі навук. Член дэлегацыі ад Беларусі на канферэнцыі ў Сан-Францыска (ЗША), дзе з іншымі ўдзельнікамі 26 чэрвеня 1945 года падпісаў ад імя нашай краіны Статут ААН. Аўтар больш як 70 навуковых прац. У кастрычніку 1947 года зняты з пасады АН Беларусі за крытыку «навуковых» тэорый Тараса Лысенкі. Вучоны з сусветным імем некалькі гадоў заставаўся без працы. У 1953 годзе Антон Раманавіч вярнуўся ў АН, дзе яго стараннямі быў створаны аддзел генетыкі і цыталогіі, які ў хуткім часе стаў самастойным інстытутам. Памёр у 1965 годзе.



Было сказана

**Ніна МАЦЯШ, паэтэса:**

*«Намарозіць радня па крыві — адагрэе радня па долі».*


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.



http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by



Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 21.118. Індэкс 63850. Зак. № 120.

Нумар падпісаны ў 19.30 8 студзеня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12